ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 43 (1065) 27 кастрычніка 2012 г. Кошт 3500 рублёў.

# КУЛЬТУРА

Лаўрэат прэміі "За духоўнае адраджэнне"

WWW.KIMPRESS.BY

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

## КАЛЯНДАР ЛІСТАПАДА



**12** **19** 12 лістапада распачынаюцца сталічныя прагляды II Нацыянальнай тэатральнай прэміі, а фінальныя ўрачыстасці адбудуцца яшчэ праз тыдзень!



# ВАРТА БЫЦЬ У ЦЭНТРЫ ПАДЗЕЙ!

**3** 130-я ўгодкі народнага паэта Беларусі Якуба Коласа

**2** **9** Стужкай Сяргея Лазніцы "У тумане" паводле аднайменнай аповесці народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава стартуе XIX Мінскі міжнародны кінафестываль "Лістапад". Завершыцца ж кінафорум фільмам "Каханне" аўстрыйца Міхаэля Ханэке.



MINSK international film FESTIVAL LISTAPAD



С. 13



С. 4 — 5

Аб'ява*

ОАО "Гомель-Белпромкультура" УНП №400069601.
ОТКРЫТОЕ АКЦИОНЕРНОЕ ОБЩЕСТВО
ГОМЕЛЬБЕЛПРОМКУЛЬТУРА

единственное специализированное предприятие по производству мебели и оборудования для библиотек и учреждений культуры предлагает

кафедры, стеллажи, столы, шкафы, банкетки, трибуны, мольберты

г. Гомель, ул. Барыкина, 82 "Б"
0232 408-172, 408-182;
+375 29 681 15 30
www.GBPK.by

**XIX Мінскі міжнародны кінафестываль “Лістапад”, які распачнецца ўжо 2 лістапада, напэўна, стане адным з самых маштабных за гісторыю форуму. 40 краін-удзельніц, больш чым 180 фільмаў, звыш 150 гасцей, восем пляцовак… “Безумоўна, “Лістапад” — самая значная падзея краіны ў сферы кінематаграфіі”, — пацвердзіла размах фестывалю на прэс-канферэнцыі, прымеркаванай да пачатку мінскага форуму, выконваючая абавязкі дырэктара Дэпартамента па кінематаграфіі Міністэрства культуры краіны Святлана Шыцікава.**

# Кінанавігатар па “Лістападзе-2012”
## за пяць дзён да адкрыцця

### Дзе і калі?

Каб не “патануць” у моры кіно, якое разальецца з 2 па 9 лістапада ў Мінску, варта вывучыць “карту” фестывалю. Сёлета асноўны конкурс ігравога кіно будзе праходзіць у кінатэатры “Цэнтральны”. Конкурс маладога кіно “Маладосць на маршы” — у Доме кіно і тым жа “Цэнтральным”. Кінатэатр “Мір” стане асноўнай пляцоўкай конкурсу дакументальных стужак. А спаборніцтва нацыянальных дакументальных кінашкол прыме ў сваіх сценах Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў у корпусе па вуліцы Чычэрына.

“Лістападзік”, па традыцыі, вітае кінатэатр “Піянер”. А вось пазаконкурсныя паказы, якіх сёлета налічваецца каля 20 (!), будуць дэманстравацца пераважна ў “Перамозе” і Доме кіно.

Цырымоніі адкрыцця і закрыцця форуму, як заўсёды, пройдуць у Палацы Рэспублікі. Але сёлета гледачы маюць магчымасць убачыць фільм адкрыцця — тытулаваную стужку Сяргея Лазніцы “У тумане” паводле аповесці Васіля Быкава — яшчэ ў кінатэатры “Кастрычнік”: акурат 2 лістапада, калі распачынаецца фестываль. Паказ карціны з удзелам акцёраў будзе зладжаны для шырокай аўдыторыі 7 лістапада.

### Пра беларускае кіно

Святлана Шыцікава зрабіла акцэнт на адмысловых праграмах беларускага кіно, што пройдуць у рамках фестывалю. Акрамя стужак бягучага і мінулага года кінастудыі “Беларусьфільм”, “Белвідэацэнтра” (праграма “Беларуская панарама” ў пазаконкурсных праграмах ігравога і дакументальнага кіно), на форуме асобным блокам “Беларускае архіўнае кіно” будуць прадстаўлены дакументальныя карціны 1960 — 70-х. Таксама, ва ўжо традыцыйнай рубрыцы “Нацыянальныя прэм’еры”, будзе паказана і новая стужка Галіны Адамовіч — “Незвычайная Бенька”.

Не абмінуў увагай фестываль і 20-годдзе Беларускага саюза кінематаграфістаў. “Арганізатары запрасілі старшыняў аналагічных саюзаў на мінскі кінафорум, — зазначыла Святлана Шыцікава, — і запрашэнне прынялі дзевяць чалавек з розных краін”.

### Цырымонія адкрыцця

Рэжысёр шоу адкрыцця і закрыцця міжнароднага кінафоруму Вераніка Янушэўская-Алштунец адзначыла, што 2 лістапада публіку чакае шмат сюрпрызаў. “Незвычайнай будзе нават тая ж “чырвоная дарожка”, — паабяцала яна. У цырымоні адкрыцця возьмуць удзел зоркі беларускага кінематографа, а гасцямі фестывалю стануць Карэн Шахназараў, Эмануіл Вітарган, Лінда Нігматуліна, Гоша Куцэнка…

Вядучыя шоу адкрыцця — Кацярына Стрыжэнава і Сяргей Кацьер.

### Журы

Каб ацаніць такую колькасць стужак, на фестывалі будуць працаваць шэсць міжнародных журы.

Расійскі рэжысёр Андрэй Звягінцаў узначаліць журы кінематаграфістаў асноўнага конкурсу. Прадзюсар Крысцін К. Уокер з ЗША — каманду, што будзе ацэньваць конкурс маладога кіно. Беларускі рэжысёр Галіна Адамовіч — на чале журы кінематаграфістаў асноўнага конкурсу дакументальнага кіно. Выбіраць жа лепшых на конкурсе нацыянальных кінашкол дакументальнага кіно маюць арт-дырэктар Міжнароднага фестывалю кароткаметражнага і дакументальнага кіно “Пасланне да чалавека” ў Санкт-Пецярбургу, праграмны дырэктар Міжнароднага кінафестывалю маладога еўрапейскага кіно “Voices” у Волагдзе Ігар Гуськоў і яго каманда.

Старшыня журы “Лістападзіка” — праграмны дырэктар Міжнароднага фестывалю фільмаў для дзіцячай і юнацкай аўдыторыі ў Зліне (Чэхія) Маркета Пашмова. А кінакрытык, мастацкі кіраўнік Ерэванскага міжнароднага кінафестывалю “Залаты абрыкос” Сусанна Аруцюнян возьме адказнасць за рашэнне журы кінапрэсы, якому выпала нялёгкая доля ацэньваць усе конкурсы ігравога і дакументальнага кіно і, нагадаем, прысудзіць “серабро” “Лістапада” ў намінацыі “Фільм як з’ява мастацтва”.

### Праграма

“Я гатовы апладзіраваць дырэкцыі фестывалю за складзеную праграму”, — так генеральны дырэктар "Мінскага кінавідэапракату" Васіль Коктыш прарэкламаваў на прэс-канферэнцыі сёлетні калейдаскоп кінапрапаноў. І падкрэсліў, што магчымасць убачыць выбранае кіно ў гледачоў ёсць, на жаль, толькі пад час фестывалю. “Таму раю купляць білеты на сеансы загадзя”, — падкрэсліў ён.

Сёння асноўная праграма ігравога кіно складаецца з трынаццаці перлін кінематографа краін “колішняга сацблока”. У ёй — і новая стужка румынскага рэжысёра, уладальніка “Залатой пальмавай галіны” Канскага фестывалю Крысціяна Мунджу “За ўзгоркамі”, і нашумелая работа расіяніна Васіля Сігарава “Жыць”, і вядомы Міхаіл Сегал з карцінай “Апавяданні”, і рэжысёр “Класа” Ілмар Рааг з фільмам “Эстонка ў Парыжы”…

Конкурс “Маладосць на маршы” прадставіць работы перспектыўных рэжысёраў з усяго свету.

Асаблівая ўвага нададзена і конкурсу для дзіцячай ды юнацкай аўдыторыі. Адкрыецца ён сёлета, дарэчы, 3 лістапада. “Праграма “Лістападзіка” гэтым разам складаецца з фільмаў, што разлічаны не толькі на дзіцячую аўдыторыю, — падкрэсліў Ігар Сукманаў, які сёлета з’яўляецца дырэктарам як праграм ігравога кіно, так і праграмы гэтага конкурсу. — Тое будуць разнастайныя жанравыя карціны — лаўрэаты і пераможцы спецыяльных кінафорумаў, — атрымаць асалоду ад прагляду якіх здолеюць і дарослыя. І асабліва — тыя, хто шукае і цэніць светлае кіно…

Што да секцыі дакументальнага кіно, то пэўнай навацыяй у ёй стаўся сёлета конкурс нацыянальных кінашкол. У ім прымуць удзел чатыры адмысловыя інстытуцыі з Арменіі, Расіі, Вялікабрытаніі і Беларусі “ў асобе” Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.

Толькі пералічыць назвы пазаконкурсных кінапраграм, колькасць якіх на “Лістападзе-2012” набліжаецца да дваццаці, падаецца справай амаль немагчымай. Ды, тым не менш, не назваць тры з іх падаецца недаравальным: гэта рэтраспектывы літоўскага рэжысёра Шарунаса Бартаса, чэшскага кінамайстра Штэфана Угера і японскага мастака Нагіса Осімы. Дырэкцыя фестывалю прадаставіла шыкоўны выбар тым гледачам, хто не здолее трапіць на паказы асноўных конкурсаў.

Асобна ўзгадаем і персанальную фотавыстаўку Дзмітрыя Елісеева — сябра і пастаяннага аўтара здымкаў для “К” — “Пра тых, каго мы любім і памятаем”, якая адкрыецца ў кінатэатры “Перамога” ў рамках кінафоруму.

Закрыецца жа “Лістапад-2012” паказам фільма — уладальніка “Залатой пальмавай галіны” сёлетняга Канскага кінафестывалю — “Каханне” аўстрыйскага кінарэжысёра Міхаэля Ханэке.

**Дар’я АМЯЛЬКОВІЧ**

# Фрэскі на сценах данжона

**У Крэўскім замку працягваюцца археалагічныя раскопкі, якія папярэднічаюць запланаваным у бліжэйшыя гады рэстаўрацыйным работам у рамках Дзяржаўнай праграмы “Замкі Беларусі”. Навукоўцы ад пачатку не сумняваліся, што ў нетрах культурнага слою аднаго з найстаражытных беларускіх замкаў тоіцца мноства невялічкіх сенсацый.У іх ліку — і фрагменты фрэсак, якія ўпрыгожвалі Княжацкую вежу.**

Яшчэ напрыканцы 1980-х даследаванні замка праводзіў археолаг Ігар Чарняўскі, які цяпер з’яўляецца начальнікам упраўлення па ахове гісторыка-культурнай спадчыны і рэстаўрацыі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь. Паводле яго слоў, сёлетнія знаходкі пацвярджаюць многія гіпотэзы больш як 20-гадовай даўніны.

> Пры аналізе хімічнага складу фарбаў, выкарыстаных пры нанясенні роспісаў Княжацкай вежы Навагрудскага замка, даследчыкі выявілі і “егіпецкую сінюю”. Яе рэцэптура лічыцца страчанай з Сярэднявечча.

— Фрагменты насценных роспісаў былі выяўлены намі яшчэ пад час першага этапа раскопак, — распавёў Ігар Чарняўскі. — А выніку сёлетніх даследаванняў яшчэ больш упэўніваюць у тым, што Княжацкая вежа ў свой час выконвала функцыі жытла. Гэта — папраўдзе важная выснова: яна дае падставы сцвярджаць, што вежа з’яўляецца не толькі першым на Беларусі данжонам, але і найстарэйшым вядомым нам мураваным жылым збудаваннем…

Асаблівую ўвагу даследчыкаў прыцягнуў хімічны склад фарбаў, выкарыстаных пры нанясенні роспісаў. У іх ліку — і “егіпецкая сіняя”, рэцэптура якой лічыцца страчанай з эпохі Сярэднявечча.

Ігар Чарняўскі перакананы ў тым, што ў Крэўскім замку будзе зроблена яшчэ нямала адкрыццяў. І няма сумневаў у тым, што найцікавейшыя з іх будуць прадстаўлены ў той самай Княжацкай вежы, дзе пасля рэстаўрацыі плануецца стварэнне музейнай экспазіцыі.

# Дыялог: Беларусь — Сербія

**Як паведамілі ў Міністэрстве культуры Рэспублікі Беларусь, у панядзелак, 29 кастрычніка, міністр культуры нашай краіны Павел Латушка сустракаецца з міністрам культуры і інфармацыі Рэспублікі Сербія Брацiславам Петкавічам.**

Мяркуецца, што перамовы і падпісанне праграмы супрацоўніцтва ў сферы культуры і мастацтва дзвюх краін адбудуцца ў Нацыянальным акадэмічным Вялікім тэатры оперы і балета Рэспублікі Беларусь.

Дадзеная праграма скіравана на развіццё сяброўства і ўзаемаразумення паміж беларускім і сербскім народамі. Гаворка вядзецца пра ўсталяванне прамых стасункаў паміж дзеячамі культуры і мастацтва абедзвюх краін ды адпаведнымі зацікаўленымі арганізацыямі, пра ўдзел музычных калектываў і выканаўцаў Беларусі і Сербіі ў міжнародных творчых акцыях.

> Падпісанне праграмы супрацоўніцтва ў сферы культуры і мастацтва паміж Беларуссю і Сербіяй паспрыяе шчыльным кантактам музычных калектываў і выканаўцаў, тэатраў, прафесіяналаў у кінавідэамастацтве, а такасама — у музейнай і бібліятэчнай справе, выставачнай дзейнасці, у сферы аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей.

Гэткі ж шчыльны саюз плануецца наладзіць паміж тэатральнымі суполкамі і тэатрамі. Маюць развівацца, натуральна, стасункі ў сферы кінавідэамастацтва, а таксама — у музейнай справе і выставачнай дзейнасці. Абедзве краіны будуць садзейнічаць сувязям Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі і Нацыянальнай бібліятэкі Сербіі, падтрымліваць супрацоўніцтва ў сферы аховы гісторыка-культурных каштоўнасцей.

**Наш кар.**

### Меркаванне ў тэму

**На нядаўняй цырымоніі ўшанавання бізнесменаў, якія з'яўляюцца актыўнымі спонсарамі і мецэнатамі сферы культуры, прысутнічаў таксама Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Сербія Уладзімір ЧУШАЎ. Ён распавёў пра бліжэйшыя планы ў галіне культурнага супрацоўніцтва паміж нашымі краінамі:**

— Мы толькі што прывезлі выстаўку твораў сербскіх мастакоў у Мінск, і яна будзе дэманстравацца ў Цэнтры сучаснага мастацтва ў рамках праекта, арганізаванага Віктарам Альшэўскім. Таксама плануем фінансава падтрымаць выданне альбома, што прысвечаны сярэднявечным фрэскам, якія маюцца ў беларускіх і сербскіх праваслаўных храмах, — такім чынам яшчэ раз падкрэслім культурную сувязь паміж нашымі народамі, блізкасць культур.

На жаль, у Сербіі не так ужо і шмат ведаюць пра Беларусь, як і беларусы — пра балканскую краіну. Таму дадзены факт патрабуе, на мой погляд, абавязковай карэкціроўкі.

Да таго ж, лічу, нашы культурныя сувязі выйдуць на больш высокі ўзровень дзякуючы будучаму візіту ў Мінск міністра культуры і інфармацыі Сербскай Рэспублікі. Плануецца падпісанне пагаднення, дзе будуць прадугледжаны тэрміны рэалізацыі нашых агульных праектаў на бліжэйшыя гады, у тым ліку і ў сферы культуры. Думаю, гэта станецца выдатным стымулам для актывізацыі адносін паміж Беларуссю і Сербіяй.

Аб'ява*

**Установа адукацыі**
**“Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”**
**аб’яўляе конкурс**
**на замяшчэнне пасад**
**прафесарска-выкладчыцкага складу:**

— выкладчык кафедры майстэрства акцёра;
— выкладчык кафедры малюнка;
— дацэнт кафедры касцюма і тэкстылю;
— старшы выкладчык кафедры касцюма і тэкстылю;
— старшы выкладчык кафедры тэорыі і гісторыі дызайну;
— выкладчык кафедры прамысловага дызайну.

***Тэрмін падачы заяў — адзін месяц з дня апублікавання аб’явы. Заявы і дакументы, згодна з Палажэннем аб конкурсе, падаваць на імя рэктара Акадэміі на адрас: 220012, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 81, аддзел кадраў; тэлефон: 292-77-34.***

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

**НАГАДВАЕМ! РАСПАЧЫНАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА ПЕРШАЕ ПАЎГОДДЗЕ 2013 ГОДА!**




**Падпісныя індэксы:**
**індывідуальная падпіска — 63875,**
**ведамасная падпіска — 638752.**

# Першы баль у Нясвіжы

**Прадэманстравае сваё танцавальнае майстэрства неўзабаве можна будзе ў Нясвіжскім палацы. Такая магчымасць з’явілася ўпершыню з часоў, калі палацам валодалі Радзівілы, дзякуючы плённаму супрацоўніцтву Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Нясвіж” з прыватнай прадзюсарскай кампаніяй. Падтрымалі падзею Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і Мінскі аблвыканкам.**



Фота niasvizh.by

Хутка ў Гетманскай зале закружацца пары...

“Першы дабрачынны Палацавы баль” у Нясвіжы пройдзе 10 лістапада. Госці, апроч шматлікіх атракцый, змогуць прыняць удзел у аўкцыёне. Сродкі ад яго пойдуць на рэстаўрацыйныя работы ў Навагрудскім замку.

“Першы дабрачынны Палацавы баль” у Нясвіжы пройдзе 10 лістапада. У гэтую ноч замак будзе сустракаць сваіх доўгачаканых гасцей феерверкам, прадставіць магчымасць сфатаграфавацца на памяць на фоне сярэднявечных рыцараў, а таксама прыняць удзел у аўкцыёне, сродкі ад якога пойдуць на рэстаўрацыйныя работы ў Навагрудскім замку.

Як адзначыў першы намеснік міністра культуры краіны Уладзімір Карачэўскі, у балі плануюць прыняць удзел звыш 170 артыстаў з Беларусі, Расіі, Германіі і Ірландыі. Уладзімір Карачэўскі падкрэсліў, што імпрэза будзе праведзена выключна на пазабюджэтныя сродкі. Тым не менш, па яго словах, удзел у дзеі будзе даступны не толькі па даволі дарагіх білетах. У прыватнасці, прынята рашэнне аб продажы іх часткі па сацыяльных коштах.

Чакаецца, што ў ноч балю прасторныя залы палаца — Залатая, Тэатральная, Гетманская, Паляўнічая ды іншыя — напоўняцца разнастайнымі танцавальнымі, музычнымі, тэатральнымі і касцюмаванымі прадстаўленнямі.

Гасцямі і ўдзельнікамі балю стануць вядомыя артысты з Беларусі, Расіі, Украіны ды іншых еўрапейскіх краін: салістка Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета нашай краіны Аксана Волкава, саліст Дзяржаўнага акадэмічнага Вялікага тэатра Расіі Аляксандр Захараў, акцёры Дзмітрый Харацьян і Марат Башараў (апошні стане вядучым балю). Чакаецца ўдзел у «Першым дабрачынным Палацавым балі» сусветна вядомай балерыны Анастасіі Валачковай. У праграме таксама запланаваны ўдзел шэрагу беларускіх інструментальных і танцавальных калектываў, у тым ліку Беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага ансамбля “Харошкі”.

Прагучаць вядомыя вальсы ў выкананні сімфанічнага аркестра Беларускага дзяржаўнага акадэмічнага музычнага тэатра. У гасцей Нясвіжскага палаца ў гэтую ноч з’явіцца магчымасць навучыцца як сярэднявечным, так і самым папулярным танцам ХХ стагоддзя — танга і фокстроту. Апроч іншага, асобная зала палаца будзе аддадзена пад старадаўнія гульні.

Плануецца, што правядзенне дабрачыннага Палацавага балю ў сценах колішняй рэзідэнцыі роду Радзівілаў стане традыцыйным і штогадовым.

**К.А.**

# Жыццё і любоў Шагала

**“Марк Шагал: жыццё і любоў” — так называецца выстаўка з калекцыі Музея Ізраіля (Ерусалім), якая з 1 лістапада будзе экспанавацца ў Нацыянальным мастацкім музеі Беларусі.**

Яна прымеркавана да 125-годдзя з дня нараджэння нашага славутага земляка і, такім чынам, як бы падводзіць вынік шагалаўскіх урачыстасцей у нашай краіне. Упершыню беларусы пабачаць творы мастака, якія да сённяшняга часу, у асноўным, экспанаваліся толькі ў Ізраілі.

У экспазіцыі будуць прадстаўлены 89 твораў Марка Захаравіча, сярод якіх — карціны “Закаханыя”, “Яўрэй, які моліцца”, “Сінагога ў Сафэдзе”, малюнкі, друкаваная графіка (афорты, літаграфіі), пейзажы, партрэты, кампазіцыі, а таксама ілюстрацыі да Бібліі, да “Басняў” Лафантэна, да кніг “Першая сустрэча” і “Мае сшыткі” Бэлы Шагал, “Мёртвыя душы” М.Гогаля і “Маё жыццё” самога Шагала.

Упершыню з арыгінальнай творчасцю мастака мы пазнаёміліся ў 1997 годзе, калі яго ўнучкі Бэла і Мерэт Майр-Грабэ прапанавалі адзначыць дзень нараджэння дзеда ў Беларусі. І гэта стала традыцыйным. З таго часу ў НММ прайшлі чатыры шагалаўскія выстаўкі: гуашы, акварэлі, літаграфіі, афорты. На цяперашняй выстаўцы “Мастакі Парыжкай школы” экспануецца дзесяць твораў Шагала.

Выстаўка “Марк Шагал: жыццё і любоў” арганізавана па ініцыятыве і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры нашай краіны, пры садзейнічанні Пасольства Беларусі ў Ізраілі і Пасольства Ізраіля ў Беларусі. Мае праект і спонсараў з ліку буйных кампаній.

Выстаўка працуе да 25 студзеня 2013 г.

# Прэзентацыі за мяжой

**Гэтымі днямі адбыліся прэзентацыі беларускай культуры ў суседніх краінах.**

Так, днямі ў латвійскай Елгаве прайшоў Тыдзень беларускай культуры. Мерапрыемства было арганізавана беларускай арганізацыяй “Лянок” пры падтрымцы мясцовай гарадской думы і садзейнічанні Пасольства Рэспублікі Беларусь у Латвіі.

Цягам некалькіх дзён жыхары і госці Елгавы змаглі наведаць шматлікія культурныя мерапрыемствы. Напрыклад, у мясцовым гарадскім Палацы культуры разгарнулася выстаўка “Генії зямлі беларускай”, прысвечаная 130-годдзю з дня нараджэння класікаў беларускай літаратуры Янкі Купалы і Якуба Коласа. Акрамя таго, адбыўся канцэрт “Беларускі кірмаш”. У ім прынялі ўдзел беларускія фальклорныя ансамблі “Лянок” (Елгава) і “Купалінка” (Даўгаўпілс), а таксама Рыжскі дзіцячы танцавальны калектыў “Івушка”.

У заключных мерапрыемствах Тыдня беларускай культуры прыняў удзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Латвіі Аляксандр Герасіменка. У прывітальным слове да ўдзельнікаў свята кіраўнік нашай дыпмісіі адзначыў высокі ўзровень беларуска-латвійскіх адносін у сферы культуры, якія паспяхова развіваюцца, у тым ліку, і на рэгіянальным узроўні.

**Учора прагучаў адзін з заключных акордаў святкавання юбілею з дня нараджэння нашага славутага класіка Якуба Коласа. У прыватнасці, Рэспубліканскае свята паэзіі завяршылася ў родных мясцінах народнага паэта — на Стаўбцоўшчыне.**

# Праект “Пясняр-2012”

Напярэдадні ўрачыстасцей прайшла прэс-канферэнцыя, якая падсумавала зробленае ў справе ўшанавання памяці і папулярызацыі творчай спадчыны Якуба Коласа. Як адзначыў намеснік міністра культуры краіны Тадэўш Стружэцкі, сёлета назіраўся шырокі ўдзел грамадскасці ў святкаванні юбілейных угодкаў нашых Песняроў. Адбываліся і праводзяцца сёння арт-праекты з гэтай нагоды, у тым ліку далёка за межамі нашай краіны.

Дырэктар Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Зінаіда Камароўская паведаміла, што да юбілейнай даты вялася актыўная выставачная работа, у тым ліку з замежнымі партнёрамі. Так, выстаўкі, прысвечаныя Якубу Коласу, з поспехам ужо прайшлі ў Расіі, ва Украіне, у Арменіі, Балгарыі, Польшчы, Літве і Латвіі…

Па словах Тадэўша Стружэцкага, асноўныя мерапрыемствы ініцыявалі Міністэрства культуры і літаратурныя музеі. Сярод новых, адметных, акцый намеснік міністра адзначыў праекты “Чытаем Коласа разам”, “130 прысвячэнняў Песняру”, да якіх далучылася шмат дзеячаў культуры, моладзь.

Разам з тым, намесніка міністра хвалюе і пытанне далейшай запатрабаванасці ў турыстаў філіяла Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа “Мікалаеўшчына”. З гэтай нагоды плануецца актывізаваць працу з найбуйнейшымі турапературамі краіны. Мяркуецца, што аб’екты “Мікалаеўшчыны” ўвойдуць у комплексныя маршруты, скіраваныя на Мір і Нясвіж.

Тым часам шэраг мерапрыемстваў з нагоды юбілейных угодкаў Якуба Коласа пройдзе ў беларускай сталіцы напярэдадні дня нараджэння класіка. У прыватнасці, 30 кастрычніка ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбудзецца адкрыццё выстаўкі работ народнага мастака Беларусі Васіля Шаранговіча, дзе прадстаўяць звыш ста яго твораў. Гэтым жа днём у яго класіка чакаецца прэзентацыя 17-га і 18-га тамоў з поўнага Збору твораў Якуба Коласа.

Акрамя таго, у філіяле Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі тэатральнай і музычнай культуры “Гасцёўня Уладзіслава Галубка” адкрыецца выстаўка “Паэма Якуба Коласа “Новая зямля” на сцэне”.

**К.А.**

# Пластыка помніка

**Днямі мае адбыцца абмеркаванне праектаў надмагільнага помніка Герою Беларусі, народнаму мастаку СССР, народнаму мастаку Беларусі Міхаілу Савіцкаму. Конкурс быў абвешчаны ў жніўні Мінскім гарадскім выканаўчым камітэтам, яго ўмовы ўзгоднены з Міністэрствам культуры краіны.**



Міхаіл Андрэевіч Савіцкі пахаваны на сталічных Усходніх могілках. Скульптары і архітэктары, якія ўдзельнічаюць у конкурсе, павінны ўлічваць планіровачную сітуацыю, што гістарычна склалася на прасторы цвінтара. Аднафігурная, паводле папярэдняй умовы, кампазіцыя надмагілля мае ў лаканічнай форме адлюстраваць маштабнасць асобы мастака і пры гэтым не ствараць выразнага дысанансу з пластыкай навакольных помнікаў. Да таго ж, помнік павінен уключаць у сябе інфармацыю, што ў дадзеным месцы пахавана жонка Савіцкага — Маргарыта Захараўна.

Работы на конкурс прымаліся да 19 кастрычніка на Мінскім скульптурным камбінаце. Яго дырэктар Таццяна Іванова паведаміла нашаму карэспандэнту, што іх каля дзесяці: усе — у запакаваным выглядзе і пад шасцізначным “кодам”. Такім жа нумарам пазначаны і запячатаны канверт, дзе знаходзіцца інфармацыя пра аўтара або аўтарскі калектыў.

У складзе журы — чатырнаццаць чалавек. Гэта архітэктары, мастакі, дызайнеры, прадстаўнікі гарадской улады і Міністэрства культуры краіны. Узначальвае журы намеснік старшыні Мігарвыканкама Ігар Карпенка.

Тое, што надмагільны помнік Міхаілу Савіцкаму ствараецца праз конкурс, сведчыць пра ўсведамленне грамадствам вялікай ролі гэтага творцы ў гісторыі нацыянальнай культуры. Пераможца конкурсу атрымае права на далейшы ўдзел у стварэнні надмагілля. Чакаць вынікаў засталося нядоўга.

**П.В.**

**На здымку: цэх Мінскага скульптурнага камбіната, дзе адбудзецца прагляд праектаў.**

# Будуецца “Zabor”: ад Мінска — да Пекіна



**23 кастрычніка ў сталіцы фінішаваў арт-праект “Zabor”. Вялікія рэпрадукцыі твораў чатырох сучасных беларускіх мастакоў — Руслана Вашкевіча, Сяргея Каваля, Уладзіміра Стальмахова і Віктара Альшэўскага — зняты з агароджы парку Чалюскінцаў і чакаюць адпраўкі ў Віцебск.**

Як паведаміла “К” брэнд-менеджар кампаніі — партнёра праекта Антаніна Серакова, “Zabor” распачаў вандроўку па краіне і замежжы. 31 кастрычніка выстаўка тых жа мастакоў у фармаце, аналагічным мінскаму, адкрыецца ў Варшаве. Праўда, на рэпрадукцыях будуць прадстаўлены іншыя творы, і экспазіцыя займее адрозную канцэпцыю. Суразмоўца “К” патлумачыла гэтую акалічнасць тым, што работы адлюстроўваюць рэаліі, звыклыя для нас, але не заўжды зразумелыя замежнікам. Такім чынам, варшаўская аўдыторыя пабачыць тое, што можна назваць інтэрпрэтацыяй савецкай мінуўшчыны сучасным выяўленчым сродкамі. Пасля Польшчы на чарзе — Кітай. Пакуль, аднак, невядома, здзейсніцца арт-праект у рамках запланаваных Дзён беларускай культуры альбо — як самастойная імпрэза.

Пасля Мінска "беларуская версія" "Забор'а" пераедзе ў Віцебск, а вось у Варшаве ды Пекіне пакажуць арт-інтэрпрэтацыю савецкай мінуўшчыны сучаснымі выяўленчымі сродкамі.

А вось мінская версія “Zabor'a” пераедзе па абласных цэнтрах. Прычым у кожным горадзе да чатырох ужо вядомых нам сталічных мастакоў будзе далучацца адзін мясцовы.

**П.В.**

# Танцуюць — усе!

**Сярод знакавых творчых падзей бліжэйшага часу намеснік начальніка ўпраўлення культуры Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Сідарэнка назваў Міжнародны фестываль сучаснай харэаграфіі, што ладзіцца ў абласным цэнтры пятнаццаты год.**

Начальнік аддзела культуры і мастацтва абласнога ўпраўлення культуры Галіна Баркевіч удакладняе для “К”, што адметны форум плануецца адкрыць 21 лістапада ў Канцэртнай зале “Віцебск”.

Цягам пяці дзён сваё мастацтва будуць дэманстраваць прадстаўнікі танцавальных школ Ізраіля, Літвы, Польшчы, Украіны, Швейцарыі, Эстоніі, Расіі, Японіі… Нашы нацыянальныя дасягненні ў гэтым кірунку прадэманструюць, у прыватнасці, артысты Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь…

Пад час фестывалю будуць прэзентаваны міжнародныя творчыя праекты харэографаў Італіі, Францыі, Нарвегіі, Расіі. А фестывальныя канцэртныя выступленні запланаваны не толькі ў Віцебску, але і ў Барысаве, Гродне ды Мінску.

# “Званы…” загучаць у час

**На пачатку кастрычніка ўраган нанёс шкоду полацкаму Сафійскаму сабору. Было знесена 300 квадратных метраў даху ад агульнай плошчы ў 600. Днямі завяршыліся аварыйна-рамонтныя работы.**

Такім чынам, фестываль “Званы Сафіі”, канцэртнай пляцоўкай якога з’яўляецца сабор, распачнецца ў запланаваны тэрмін — 28 кастрычніка. У дырэкцыі Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка нам паведамілі, што дах знесла амаль цалкам — усе 600 квадратных метраў, бо што стыхія не знесла, тое сапсавала.

Заменены кроквы, у сабора — новае металічнае дахавае пакрыццё. Між тым, доўжаца раней запланаваныя рамонтна-будаўнічыя работы ўнутры будынка і звонку. Ідзе замена вокнаў, удасканальваецца водазліўная сістэма, рамантуюцца фасады.

Полацкая Сафія даўно служыць канцэртнай залай, але дагэтуль не мае адпаведнай названай функцыі вентыляцыі. Будзе вырашана і гэтае пытанне.

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 або kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** тэму на www.facebook.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

**Вёску Беніца, што ў Маладзечанскім раёне, экскурсіі абмінаюць бокам. Яны едуць далей: у Залессе, Смаргонь, Крэва... Затое гэтае месца карыстаецца асаблівай папулярнасцю сярод прыхільнікаў так званага альтэрнатыўнага турызму — аматараў “незапатрабаваных” адметнасцей, што, зрэшты, вытлумачальна.**

**Звычайна закінутыя храмы — гэта зарослыя хмызом руіны. Тыповы прыклад — рэшткі касцёла пачатку XIX стагоддзя ў вёсцы Дубрава таго самага Маладзечанскага раёна, якія на сёння, дарэчы, нават не маюць статуса помніка спадчыны. Ёсць куды больш велічныя руіны касцёлаў у Вялікай Бераставіцы, Лыскаве, Смальянах, Княжыцах, Селішчы, Зембіне... Спалучэнне выбітных узораў еўрапейскага дойлідства ды атмасферы заняпаду і сапраўды выклікае недаўменне.**

# “Бомж” рэспубліканскага значэння

## Ці паўплывае вандал з сацыяльных сетак на “кепскі актыў” і "мудрае" рашэнне?



Але прыехаўшы ў Беніцу, цікаўны падарожнік ніякавее ад здзіўлення. Перад ім — шыкоўны касцёл эпохі сталага барока, сапраўдны архітэктурны шэдэўр самага пачатку XVIII стагоддзя, створаны італьянскімі дойлідамі. Ён цалкам ацалеў, дах пакуль на месцы і нават мае керамічнае пакрыццё. І пры гэтым храм поўнасцю кінуты на волю лёсу! У такое нават цяжка паверыць…

Прыкасцельная тэрыторыя падзарасла травой, але вышыня той невялікая, і гэта ўскосна сведчыць пра тое, што суботнікі тут зрэдчас усё ж праводзяцца. Шыбы сям-там яшчэ засталіся, а вось вадасцёкавыя трубы яўна спатрэбіліся камусьці ў гаспадарцы, і іх адсутнасць выразна адбіваецца на мурах з 300-гадовай гісторыяй…

Галоўныя дзверы касцёла Святой Тройцы зачынены на навясны замок. На іх вісіць і ахоўная дошка, якая ў дадзеным выпадку мае перадусім “метафізічную” сілу. Тым больш, абышоўшы вакол касцёла, можна лёгка патрапіць унутр з боку сакрыстыі.

— Так, я ведаю, што гэтыя дзверы ўжо выламалі, — сумна канстатуе метадыст Маладзечанскага РМЦ Настасся Марчанка, якая адказвае за ахову гісторыка-культурнай спадчыны ў раёне. — Літаральна сёлета мы іх устаўлялі наноў, але... Пратрывалі яны зноў нядоўга…

Унутры здзіўляешся бялюткай тынкоўцы на барочным купале ды сценах. Нават адразу і не верыцца, што ў гэтым велічным храме апошняя імша прайшла многія дзесяцігоддзі таму. Ды неўзабаве ўсё ж хоцькі-няхоцькі разумееш, што сёння яго паўнапраўнымі "уласнікамі" з'яўляюцца адны галубы: пра гэта сведчыць пакінутае імі пер'е... і не толькі яно.

Адважны турыст можа беспраблемна ўзняцца на хоры, а потым і на адну з вежаў, адкуль адкрываюцца шыкоўныя краявіды. Лесвіца цалкам памысная, хіба некалькі прыступак ужо прагнілі. Адмыслоўцы ведаюць і лаз у крыпту, дзе па-ранейшаму знаходзяцца астанкі фундатараў касцёла з роду Коцелаў. Яшчэ за савецкім часам іх труны былі ўскрыты нейкімі “скарбашукальнікамі”.

— Мы паскладалі косткі назад у дамавіны і ўставілі краты на вокны ў крыпту, каб спыніць туды доступ, — распавядае пробашч парафіі Святога Роха ў Палачанах Сяргей Бараўнёў, які апякуе таксама і невялічкую каталіцкую супольнасць у Беніцы.

Але нядаўнія падзеі засведчылі, што гэтых захадаў аказалася замала.

### Косткі “ў вольным доступе”

Безумоўна, альтэрнатыўны турызм — гэта цалкам пахвальнае хобі. Яно садзіночае збольшага людзей культурных ды зацікаўленых і не абы-як спрыяе папулярызацыі “прызабытых” помнікаў спадчыны. Але ў сям'і, як кажуць...

Сёлета ў студзені адзін з такіх “турыстаў” змясціў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы зробленае ў крыпце фота, на якім ён з усмешкай трымае па чэрапе ў кожнай руцэ. А потым выхваляўся перад “фрэндамі”: маўляў, прыхапіў сабе сувеніры на памяць... Убачыўшы гэты здымак, неабыякавы жыхар Маладзечна звярнуўся ў праваахоўныя органы з хадайніцтвам аб узбуджэнні крымінальнай справы па факце апаганьвання месца пахавання. Але міліцыя палічыла, што, паколькі косткі знаходзяцца “ў вольным доступе”, у пазіраванні з імі на фота складу злачынства няма.

Літаральна праз які месяц храм ізноў апынуўся ў цэнтры ўвагі праваахоўных органаў. Гэтым разам прычына была нават больш сур'ёзная.

Ні для каго не сакрэт, што закінутыя помнікі спадчыны карыстаюцца шалёнай папулярнасцю і сярод іншай катэгорыі “турыстаў” — мясцовых люмпенаў. Беніцкі касцёл Святой Тройцы — не выключэнне. На яго сценах можна ўбачыць не толькі рэшткі фрэсак, але і тыя надпісы, якія ў газеце не працытуеш, на падлозе трапляюцца “бычкі” ды парожнія пляшкі… Пэўна, тутэйшых выпівакаў таксама вабяць прыгажосць і экстрым — альбо проста цеплыня і дах над галавой?

Пакаранне за падобныя свавольствы прадугледжваюць не толькі духоўныя законы, але і банальная тэорыя верагоднасці. Амаль усе такія помнікі спадчыны знаходзяцца ў аварыйным стане, і кожнае баляванне ў іх можа лагічна скончыцца бядой. Мала хто сумняваўся ў тым, што рана ці позна яна здарыцца. І такі здарылася — па волі лёсу, менавіта ў Беніцы.

У сакавіку гэтага года двое мужчынаў выпівалі непасрэдна ў касцёле, забраўшыся на хоры. Адзін ударыў другога, той паваліўся долу з чатырохметровай вышыні... “Хуткая” ўжо не спатрэбілася.

— Па шчырасці, мяне нават здзіўляе, што жыхары Беніцы робяць такія прыкрыя рэчы, — кажа Настасся Марчанка, — бо вёска ж маленькая, усе адно аднаго ведаюць... Там жа і парафія каталіцкая існуе, прычым зарэгістравана яна менавіта па адрасе касцёла...

Ды, як адзначыў ксёндз Сяргей Бараўнёў, парафія тая складаецца хіба з некалькіх чалавек, і “ўправіць мазгі” сваім аднавяскоўцам яны не ў стане. Не кажучы ўжо пра тое, каб сваімі сіламі прывесці касцёл да ладу ды яго ўтрымліваць…

Па вялікім рахунку, у гэтым палягае асноўная праблема адраджэння ці не ўсіх занядбаных помнікаў сакральнага дойлідства. Менавіта таму ніякага імпэту ў справе вяртання касцёла каталікі Беніцы і не праяўляюць. Зрэшты, прычына тут таксама і ў іншым.

### Без пашпарту і прапіскі

Без сумневу, абодва згаданыя вышэй выпадкі цяжка было б сабе ўявіць, калі б дадзены помнік спадчыны проста меў гаспадара (мы не кажам тут пра выкарыстанне, бо гэта ўсё ж розныя рэчы). Любы гаспадар знойдзе спосаб абараніць сваю ўласнасць ад “вольнага доступу” — нават тую, якая яму пакуль не надта патрэбна. І калі нейкія прайдзісветы сунуцца на “чыйнуе” тэрыторыю (няхай сабе самае лядашчае лецішча), яе ўласнік гэта так проста не пакіне.

Прыкладам, касцёл Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі ў Мсціславе пакуль таксама не выкарыстоўваецца для набажэнстваў: маленькая парафія, якой ён прыналежыць, не мае дастаткова сродкаў, каб завяршыць маштабную рэстаўрацыю. Але ж дзверы там — на замку, і для “турыстаў” з пляшкай у кішэні яны заўсёды зачынены. Затое сапраўдным турыстам ахвотна пакажуць унікальныя фрэскі на гістарычную тэматыку. У таго касцёла ёсць гаспадар — і гэтым усё сказана.

Але... Як выявілася, касцёл у Беніцы — гісторыка-культурная каштоўнасць рэспубліканскага значэння! — сёння з'яўляецца безгаспадарным. І дэ-факта, і нават дэ-юрэ.

— Касцёл на дадзены момант не прыналежыць нікому, — распавяла Настасся Марчанка. — І ўжо даўно мы спрабуем вызначыць яго ўласніка…

Лёс гэтага храма ў савецкую пару на пачатку быў досыць тыповым: доўгі час храм выкарыстоўваўся як калгасны склад, паступова прыходзячы ў заняпад. Але недзе ў гады “перабудовы” пачалася яго рэстаўрацыя — праўдападобна, менавіта дзякуючы ёй дах будынка і па сёння амаль не працякае, хаця дахоўка ўжо месцамі і абвалілася.

Далей — усё заглухла, рыштаванні пайшлі на дровы. А касцёл па-ранейшаму боўтаўся на балансе мясцовай гаспадаркі. Яе “захады” па ўтрыманні архітэктурнага помніка (ці, дакладней, іх адсутнасць) яўна не адпавядалі патрабаванням айчыннага заканадаўства, і таму спецыялісты ў сферы аховы спадчыны сталі даймаць з той нагоды кіраўніцтва СВК. У 2007 годзе яно прыняло “мудрае” і простае рашэнне: адмовіцца ад гэтага свайго “кепскага актыву”, які гаспадарцы ніякай карысці ўсё адно не прыносіць...

З таго часу храм Божы і не мае “прапіскі” на гэтай зямлі. Ён стаў своеасаблівым “бамжом” у цяперашняй рэчаіснасці — з усімі характэрнымі для такога статуса наступствамі.

Ахоўныя абавязацельствы на помнік спадчыны, зразумела ж, не падпісаны: няма з кім. Сёлета райаддзел культуры прапанаваў гэта зрабіць Мінска-Магілёўскай архідыяцэзіі, але атрымаў лагічную адмову: падпісваць такі дакумент можа толькі ўласнік аб'екта, а касцёл ім на сённяшні дзень не з'яўляецца.

Натуральна, вызначыць (або “прызначыць”) фармальнага ўласніка не так і складана: можна, прыкладам, “падарыць” касцёл тамтэйшаму сельсавету, як нярэдка рабілася ў падобных выпадках. Але айчынная практыка пераканаўча сведчыць за тое, што праблему самога помніка такі крок не вырашыць ні на каліва. Бо якія ў таго сельсавета магчымасці?

І таму раённыя ўлады бачаць толькі адзін варыянт развіцця падзей: перадачу храма Рыма-Каталіцкаму касцёлу на Беларусі. Але тут паўстае яшчэ адна перашкода — адсутнасць праваўсталёўчых дакументаў на будынак. Касцёл, бачыце, аказаўся і без прапіскі, і без пашпарту.

На жаль, гэта далёка не адзіны такі аб'ект у нашай краіне: падобная праблема досыць распаўсюджаная. Вядома, тут можна зрабіць акцэнт на пытанне: як сталася, што аб'ект дзяржаўнай уласнасці, які, да таго ж, ужо даўно мае статус помніка спадчыны, аказаўся без дакументаў? Хто ў тым вінаваты?

У студзені адзін з “альтэрнатыўных турыстаў” змясціў на сваёй старонцы ў сацыяльнай сетцы зробленае ў крыпце фота, на якім ён з усмешкай трымае па чэрапе ў кожнай руцэ. А потым выхваляўся перад “фрэндамі”: маўляў, прыхапіў сабе сувеніры на памяць... Убачыўшы гэты здымак, неабыякавы жыхар Маладзечна звярнуўся ў праваахоўныя органы з хадайніцтвам аб узбуджэнні крымінальнай справы па факце апаганьвання месца пахавання. Але міліцыя палічыла, што, паколькі косткі знаходзяцца ў "вольным доступе", у пазіраванні з імі на фота складу злачынства няма...

Ды куды важней згадаць пра другое пытанне з гэтага асацыятыўнага шэрагу, трохі яго перафармуляваўшы: што рабіць і — каму?

Адказ на першую частку — відавочны: пакуль не будзе падрыхтаваны належны пакет праваўсталёўчых дакументаў, лёс касцёла прынцыпова не вырашыцца. Але хто мусіць дапамагчы “бамжу” аднавіць “паперы”, выдаткаваўшы на гэтую мэту патрэбныя сродкі? Як падаецца, адказ тут — адзін: толькі раённыя ўлады. Варта прывесці хаця б такі аргумент: касцёл у Беніцы з'яўляецца найстарэйшым і адным з найкаштоўнейшых помнікаў Маладзечанскага раёна!

Як паведаміла Настасся Марчанка, ужо рыхтуецца рашэнне райвыканкама, згодна з якім Лебедзеўскі сельсавет, на чыёй тэрыторыі знаходзіцца Беніца, возьме на сябе функцыю падрыхтоўкі праваўсталёўчых дакументаў на касцёл. Хочацца верыць, што і патрэбнае фінансаванне на гэтыя мэты знойдзецца.

"Культура" № 43
27 кастрычніка 2012 г.



## Дзверы да паланэза

Безумоўна, адзін гэты крок усіх праблем не вырашыць. Ды і спадзявацца на тое, што некалькі вернікаў з Беніцы самі адужаюць рэвіталізацыю вялізнага храма, таксама не выпадае. Хаця, як кажа ксёндз-пробашч, патрэба ў месцы для малітвы там ёсць.

Айцец Сяргей Бараўнёў ужо мае досвед аднаўлення святыні ў гэтым краі: не так даўно шмат у чым яго стараннямі ў вёсцы Палачаны з'явіўся маленькі касцёльчык. Святар рупіцца і аб захоўванні памяці пра тыя храмы Маладзечаншчыны, ад якіх засталіся хіба падмуркі.

На думку Настассі Марчанка, аднаўленне касцёла магло б стаць сумесным пачынам каталіцкіх і муніцыпальных улад, з разлікам таксама і на пэўную падтрымку з рэспубліканскага бюджэту (балазе сродкі ў сукупнасці патрэбны не такія і вялікія). Ды і сам храм пасля рэстаўрацыі мог бы паралельна выконваць і культурныя функцыі — прыкладам, канцэртнай залы для камернай (а можа, у перспектыве, і арганнай) музыкі.

Такі сінтэз досыць распаўсюджаны ва ўсім свеце. Тым больш, як адзначаюць навукоўцы, Беніцкі касцёл валодае папраўдзе ўнікальнымі акустычнымі ўласцівасцямі.

Вядома, пакуль такая ідэя можа выклікаць хіба іранічную ўсмешку: маўляў, а дзе ж у Беніцы ўзяць слухачоў для аншлагавых камерных канцэртаў? Але літаральна за пятнаццаць кіламетраў ад яе мы заўважым знакамітае Залессе, і каб патрапіць у Беніцу па дарозе "да Агінскага", мінчанам нават не давядзецца накручваць кола. Пакуль, зрэшты, турыстаў бракуе і ў Паўночных Афінах: там сёння паўнапраўна валадараць будаўнікі. Здача аб'екта плануецца ўжо на наступны год, і, значыць, неўзабаве наведвальніка будзе чакаць не змрочны палац з пазабіванымі вокнамі пасярод здзічэлага парку, а прывабны культурна-турыстычны цэнтр, "асвечаны" знакамітым імем. Каб ужо сёння прагназаваць яго запатрабаванасць, можна проста з'ездзіць у Нясвіж. Верагодна ж, асабліва акцэнт у Залессі будзе зроблены менавіта на музыку. Адпаведна, яшчэ адна добрая канцэртная зала ў гэтым рэгіёне акажацца не лішняй.

Паабапал ад добрай асфальтавай дарогі, што вядзе да Беніцы, таксама трапляюцца цікавосткі. Асабліва ўражвае гатычная каплічка на могілках у Лебедзеве — не раўнуючы, віленская святая Ганна ў мініяцюры! І хаця кожны абазнаны чалавек адразу вызначыць, што веку ёй — усяго гадоў сто, на ўражанні гэта асабліва не ўплывае. Непадалёк адсюль, у Маліноўшчыне, можна ўбачыць і яшчэ адну капліцу-пахавальню — гэтым разам у выглядзе піраміды! Аб'ект не ўнікальны, але — вельмі рэдкі, і не толькі па беларускіх мерках. Дадамо яшчэ праваслаўныя цэрквы ў Лебедзеве, Маркаве ды самой Беніцы... Паглядзець у тых мясцінах папраўдзе ёсць што.

...Некаторыя кажуць, што марыць — шкодна. Можа, яно і так. Але ж усведамляць рэальны турыстычны патэнцыял звышпраблемных сёння аб'ектаў — наадварот неабходна. Бо бачанне далёкіх перспектыў надае патрэбны імпэт і жаданне пераадольваць усе надзённыя цяжкасці.

Зрэшты, і пад ногі глядзець не лішне. Многія апісаныя вышэй праблемы Беніцкага касцёла можна лёгка вырашыць, увеўшы пасаду вартаўніка (нават не важна, у чым штаце). Альбо і яшчэ працай ды "бюджэтней": паставіўшы добрыя дзверы, якія "з нагі" не адкрыеш. Думаецца, супольных намаганняў і добрых намераў усё ж хопіць для гэтага канкрэтнага кроку…

**Ілья СВІРЫН,**
**наш спецыяльны карэспандэнт**
**Мінск — Маладзечанскі раён — Мінск**
**Фота аўтара**

Актуальнае пытанне

# Хто каго: "зацікаўленыя асобы" vs. археалагічныя помнікі

## Што хаваецца за разрабаванымі курганамі?

**На мінулым тыдні адбылася першая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь пятага склікання. Галоўнымі пытаннямі на парадку дня пасяджэння сесіі сталі абранне кіраўніцтва верхняй палаты парламента і фарміраванне пастаянных камісій. У прыватнасці, у склад пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы ўвайшоў доктар гістарычных навук, прафесар, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.Куляшова Ігар МАРЗАЛЮК. Карэспандэнт "К" пагутарыў з вучоным наконт актуальных пытанняў сферы культуры, на якія будзе звернута першачарговая ўвага сенатара.**

**— Папярэднім складам Савета Рэспублікі разгледжана даволі шмат законапраектаў, сярод якіх былі і тыя, што маюць непасрэднае дачыненне да развіцця айчыннай культуры…**

— Не ў маёй кампетэнцыі ацэньваць працу папярэдняга складу Савета Рэспублікі, але відавочна, што зроблена шмат для нармальнага развіцця сферы. Да прыкладу, хочацца адзначыць грунтоўны Закон аб музейнай дзейнасці: ён вельмі дакладна рэгулюе магчымасці працы з музейнымі артэфактамі.

Што да заканадаўства ў сферы аховы помнікаў нашай спадчыны, то на сённяшні дзень тут слабая праваахоўная практыка па абароне нерухомых і рухомых матэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей. І самая вялікая група рызыкі — археалагічныя помнікі. І гэта прытым, што ў нас вельмі жорсткае заканадаўства ў сферы аховы прыроды, што можна толькі вітаць. Пры ўсім тым, прыродныя рэсурсы збольшага — узнаўляльныя: мы можам пасадзіць новы лес, ачысціць рэкі, зарыбіць вадаёмы. А знішчаны гісторыка-культурны помнік, мы яго страчваем незваротна…

**— Якая, на вашу думку, найбольшая пагроза для помнікаў археалогіі?**

— У нашай краіне ёсць нямала людзей, якія з 1991 года лічацца афіцыйна беспрацоўнымі і, тым не менш, маюць шыкоўныя аўтамабілі, дамы, рэгулярна адпачываюць на курортах. Усё гэта — "за кошт" помнікаў. Справа ў тым, што маюцца артэфакты, якія каштуюць пару дзясяткаў тысяч рублёў, а ёсць і тыя, што прадаюцца за тысячы еўра. Я ўжо не кажу пра страты для айчыннай гісторыі. Што і казаць, наша мінулае ў шэрагу выпадкаў уяўляе з сябе палімпсест з зацёртымі, выдранымі старонкамі. За гэта і баліць сэрца.

Праблема яшчэ і ў наступным: неліквідныя на замежным чорным рынку археалагічныя артэфакты "чорныя капальнікі" прыносяць на продаж у дзяржаўныя музеі краіны. Шкада, што музейшчыкі часта патураюць "чорным археолагам", купляючы ў іх падобныя рэчы. Па вялікім рахунку, гэта — скупка крадзенага, што само па сабе з'яўляецца правапарушэннем.

**— Якія захады вам бачацца першачарговымі, каб эфектыўна абараніць нашу спадчыну?**

— Трэба прыняць жорсткую шкалу штрафаў. Да прыкладу, калі чалавек будзе плаціць дзяржаве за выкапаную медную манету столькі, колькі каштуе залаты дукат, то задумаецца. Іншая справа, што ў нас дагэтуль не пасадзілі ніводнага з тых, хто разрабаваў старажытныя селішчы, вывозіць за межы краіны каштоўнасці. У адной Магілёўскай вобласці, па маіх падліках, трыста чалавек займаюцца незаконнай археалагічнай дзейнасцю. Акрамя таго ладзяцца і экспедыцыі на сумежных тэрыторыях, у якіх удзельнічаюць не толькі нашы "чорныя капальнікі", але і іх "калегі" з Расіі, Украіны, Літвы. Калі тэндэнцыя будзе назірацца і надалей, то праз дзесяць-пятнаццаць гадоў помнікаў археалогіі ў нас практычна не застанецца…

Адзін прыклад. Днямі я прыехаў з Асіповіцкага раёна, дзе "аматары археалогіі", якія, да ўсяго, вучацца на гістарычным факультэце, з мэтай нажывы амаль цалкам знішчылі археалагічную групу: там былі знойдзены візантыйскія манеты, а вакол — раскіданы астанкі нашых продкаў…

Перакананы: для эфектыўнай абароны спадчыны патрэбны дэпартамент, археалагічная міліцыя, альбо спецыяльнае падраздзяленне КДБ. Як бы дзіўна гэта ні гучала, але адзін з самых "мацёрых" "чорных капальнікаў" яшчэ колькі гадоў таму з'яўляўся высокапастаўленым чыноўнікам сістэмы пракуратуры краіны. Парадокс у тым, што гэты генерал нават не хаваў свайго хобі: ён — аўтар спецыялізаванай кнігі. У выніку многія мяркуюць так: калі можна капаць людзям у пагонах, то чаму нельга займацца "археалогіяй" мне? Таму патрэбна правесці і інфармацыйную кампанію.

**— Ці толькі археалагічныя праблемы выклікаюць у вас занепакоенасць?**

— Ёсць і яшчэ адна не менш важная праблема, наўпрост звязаная з гістарычнымі каштоўнасцямі. Мы — адзіная краіна на постсавецкай прасторы, у якой няма спецыялізаванага органа па рэстытуцыі гісторыка-культурных каштоўнасцей. Як вядома, пад час Вялікай Айчыннай шмат каштоўнасцей з абласных і рэспубліканскіх музеяў было вывезена на часовае захоўванне да канца вайны ў Расію. Парадаксальна, але, нягледзячы на тое, што мінула больш за 60 гадоў з дня Вялікай Перамогі, іх дагэтуль нам не вярнулі. Гэта беларуская ўласнасць, дакументы і законныя правы на якую мы маем.

Дзякуючы руплівай працы Асацыяцыі беларусістаў свету, у тым ліку — выбітнага вучонага Адама Мальдзіса, мы ведаем, што і дзе знаходзіцца. Але пры гэтым у нас няма дакладна вызначанай працэдуры вяртання каштоўнасцей.

**— Зараз у суайчыннікаў з'явілася магчымасць набыцця старадаўніх маёнткаў за сімвалічны кошт з мэтай іх далейшага выкарыстання ў турыстычнай галіне. Якая ваша пазіцыя ў дадзеным пытанні?**

— Стаўлюся да гэтага толькі пазітыўна. Тым больш, разам з сядзібай уладальнік атрымлівае і шэраг абавязкаў. Іншае пытанне — адносна далейшага кантролю за рэстаўрацыйнымі работамі на аб'екце. Павінен быць і галоўны архітэктар праекта, і навуковы кіраўнік, прызначаны Міністэрствам культуры. Трэба, каб чалавек, што вырашыўся на такі крок, усведамляў усю адказнасць. Здараліся выпадкі, калі архітэктурны помнік наўмысна даводзіўся да аварыйнага стану. Схема была такой: "зацікаўленыя асобы" наймалі мясцовых бадзяжнікаў, якія за бутэльку ламалі нясучыя сцены помніка. Камісія з выканкама вызначае, што будынак неабходна рэканструяваць без рэстаўрацыі, — у выніку зносяцца гістарычныя падмуркі, рэшткі збудавання і з сілікатнай цэглы ствараецца новы гмах, які з цягам часу выводзіцца са Спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей… На жаль,

> Ігар Марзалюк: "Здараліся выпадкі, калі помнік наўмысна даводзіўся да аварыйнага стану. Схема была такой: "зацікаўленыя асобы" наймалі мясцовых бадзяжнікаў, якія за бутэльку ламалі нясучыя сцены помніка. Камісія з выканкама вызначае, што будынак неабходна рэканструяваць без рэстаўрацыі, — у выніку зносяцца гістарычныя падмуркі, рэшткі збудавання і з сілікатнай цэглы ствараецца новы гмах, які з цягам часу выводзіцца са Спіса гісторыка-культурных каштоўнасцей… На жаль, падобныя выпадкі яшчэ колькі гадоў таму можна было назіраць у розных кутках краіны".

падобныя выпадкі яшчэ колькі гадоў таму можна было назіраць у розных кутках краіны.

**— Але часам можна пачуць і наступную думку: лепш атрымаць штраф за няўзгодненыя работы на аб'екце гісторыка-культурнай спадчыны, чым збіраць усялякія ўзгадненні ды губляць свой час…**

— Трэба мець на ўвазе, што наўмыснае знішчэнне гісторыка-культурнага помніка цягне ўжо на крымінальную адказнасць. Знішчыў помнік — мусіш адседзець у турме каля трох гадоў. У Крымінальным кодэксе на гэты конт усё падрабязна прапісана. Урэшце, у кожным раёне павінен быць спецыяліст, інспектар па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, надзелены адпаведнымі паўнамоцтвамі.

**— Але ж стварэнне спецыялізаваных падраздзяленняў, дэпартаментаў, пашырэнне штату ў аддзелах культуры цягне за сабой і немалыя выдаткі…**

— Колькі гадоў таму ў Шклове быў знойдзены скарб, рынкавы кошт якога перавысіў 500 тысяч еўра. Хочацца параіць тым, хто кажа пра эканамічную немэтазгоднасць стварэння дэпартамента па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, у тым ліку археалогіі, сумленна "даследаваць" усе сайты, інтэрнэт-аўкцыёны ды высветліць аб'ём і вартасць рынку незаконна раскапаных беларускіх каштоўнасцей. Перакананы, затраты на стварэнне падраздзялення акупяцца імгненна — хаця б праз штрафы і канфіскацыю каштоўнасцей у "чорных капальнікаў" ды скупшчыкаў крадзенага. Добры прыклад маецца ў Ізраілі, дзе існуе археалагічны спецназ: гэтыя хлопцы не толькі валодаюць цудоўнай армейскай падрыхтоўкай, але, да таго ж, з'яўляюцца і выдатнымі мастацтвазнаўцамі.

**— Якія прыярытэтныя кірункі вашай дзейнасці ў Савеце Рэспублікі вы можаце адзначыць?**

— Пад час выбараў у Савет Рэспублікі я падкрэсліваў, што для мяне вельмі важным з'яўляецца развіццё рэгіянальных гісторыка-турыстычных маршрутаў і цэнтраў. Што да канкрэтнай дзейнасці, то праз некалькі дзён вяртаюся на Магілёўшчыну і разам з калегамі займуся падрыхтоўкай серыі суботнікаў на старадаўнім Быхаўскім замку: мы плануем да будучага Дня пісьменства прывесці ў належны выгляд гэты ўнікальны гістарычны аб'ект. Карыстаючыся нагодай, запрашаю ўсіх аматараў культуры эпохі Вялікага Княства Літоўскага з наступнай суботы прыняць удзел у нашых мерапрыемствах. Падкрэслю: гэта цалкам валанцёрская акцыя. У рамках яе плануецца зрабіць геафізічнае даследаванне замка, у прыватнасці, высвеліць таямніцы, схаваныя на глыбіні ў трыццаць метраў.

**— Ці плануеце вы працягваць і сваю прафесійную навуковую дзейнасць? Наколькі гэта сёння для вас актуальна?**

— Безумоўна! У бліжэйшыя месяцы будзе прэзентавана новае выданне "Беларускі гістарычны альманах", галоўным рэдактарам якога я з'яўляюся. Там прадстаўлены матэрыялы гісторыкаў з Усходняй Еўропы, якія з павагай ставяцца да нашай краіны. У прыватнасці, адлюструем старажытную і сярэднявечную гісторыю нашай зямлі. Ужо падабрана шмат архіўных матэрыялаў, якія дагэтуль былі невядомымі ў навуковых колах. Для гэтага былі арганізаваны экспедыцыі ў Кракаў. Гэта адзін з супольных праектаў з нашымі суайчыннікамі ў Расіі, а таму хачацца выказаць падзяку Валерыю Казакову, старшыні Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі "Беларусы Расіі".

**— У вашым горадзе выявілася яшчэ адна цікавая ініцыятыва: Музей гісторыі Магілёва змог актывізаваць грамадскасць з мэтай набыцця каштоўных старадрукаў…**

— На жаль, у музейнай сістэме Міністэрства культуры шмат дырэктараў, якія прывыклі выкарыстоўваць толькі бюджэтныя сродкі на набыццё тых ці іншых артэфактаў. Музей жа гісторыі Магілёва вылучаецца тым, што для збору сродкаў праводзіць разнастайныя канцэрты, акцыі, суботнікі. Тым самым кіраўніцтва музея актывізуе неабыякавых да айчыннай гісторыі людзей.

Разам з тым, мяркую, што ўсе тыя кніжныя скарбы, якія належаць нашай культуры, але знаходзяцца за межамі Беларусі, мусяць вярнуцца, хаця б у электронных копіях. Мы павінны сабраць такую бібліятэку і ўвесці тым самым у гістарычны дыскурс як мага больш навуковай, краязнаўчай літаратуры.

**Кастусь АНТАНОВІЧ**



**Другая Нацыянальная тэатральная прэмія набірае абароты — не проста з кожным тыднем і нават не з кожным днём, а ўжо літаральна з кожнай гадзінай. Хаця, здавалася б, да яе фінальных акордаў яшчэ ёсць час: вынікі будуць падведзены 19 лістапада. Але на тое яны і вынікі, што становяцца "вынікам" працы арганізатараў ды ўсіх дзеячаў тэатра больш як за год.**

**Пра тое, якую мастацкую вагу і грамадскую значнасць набывае Рэспубліканскі конкурс тэатральнага мастацтва, як адбываецца падрыхтоўка ўрачыстасцей, "К" распавядаюць першы намеснік міністра культуры Рэспублікі Беларусь Уладзімір КАРАЧЭЎСКІ і намеснік дырэктара па ідэалогіі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М.Горкага Валянціна СЦЯПАНАВА, якая займаецца каардынацыяй арганізацыйных пытанняў.**

# Прэміяльна!

— Нацыянальная тэатральная прэмія, — кажа Уладзімір Карачэўскі, — адно з самых значных мерапрыемстваў, якое скіравана на падтрымку нашага тэатральнага мастацтва, бо ў выніку гэтага конкурсу вызначаюцца, шырока паказваюцца і адзначаюцца лепшыя тэатральныя работы ва ўсіх галінах. Тут і лепшыя спектаклі, прычым розных жанравых кірункаў, разлічаныя на розную ж узроставую аўдыторыю. Тут і лепшыя ролі — жаночая ды мужчынская. Асобнымі намінацыямі прадугледжана заахвочванне рэжысёраў, мастакоў, аўтараў музыкі і харэографаў.

Дадам, што сёлета, у параўнанні з правядзеннем Першай Прэміі, намінацый стала яшчэ больш. Увогуле, праца над удасканаленнем Палажэння аб правядзенні конкурсу, над паляпшэннем самога працэсу вызначэння намінантаў, над разнастайнымі арганізацыйнымі пытаннямі, якія паўставалі і паўстаюць у час мерапрыемства, пачалася адразу пасля завяршэння леташняй цырымоніі ўзнагароджвання пераможцаў. Многія ідэі ўзнікалі і непасрэдна пад час арганізацыі ды правядзення Першай Нацыянальнай прэміі. Дый адразу пасля яе завяршэння мы не спынілі абмеркаванняў з дзеячамі культуры. Размовы датычыліся не толькі непасрэдных вынікаў, але і, галоўнае, прапаноў, якія дапамаглі б удасканаліць пошук і вылучэнне ўсяго самага лепшага, што з'явілася апошнім часам у нашых тэатрах. Так будзе працягвацца і надалей, бо ўсе зацікаўлены ў тым, каб



такая высокая ўзнагарода, як Нацыянальная прэмія, мела і адпаведныя мастацкія крытэрыі.

**— Дык на якім этапе знаходзіцца праца зараз? Вядома, што праведзены папярэдні агляд дасланых заявак, ужо сфарміравана кола спектакляў, якія будуць паказаны ў Мінску (іх спіс, дарэчы, друкавала і "К")...**

— Мы ўвесь час, што называецца, трымаем руку на пульсе. Пасяджэнні Арганізацыйнага камітэта праходзяць двойчы на тыдзень. Пад час іх штораз вырашаюцца самыя надзённыя пытанні. Любы конкурс — гэта жывы арганізм, а творчы — тым больш. І вельмі прыемна, што намаганні не праходзяць дарма. Ужо сёння зразумела: Другая Нацыянальная прэмія выклікала яшчэ большую зацікаўленасць тэатраў, у параўнанні з Першай. Прывяду толькі дзве лічбы: было вылучана 39 спектакляў 28-і тэатраў. Такая актыўнасць не можа не радаваць. Бо летась у кагосьці былі развагі, ваганні, няўпэўненасць: маўляў, спачатку паглядзім, як яно там атрымаецца. Калі ж напраўдзе "атрымалася", у дзеячаў тэатра ўзнікла ўпэўненасць, што гэта далёка не разавае мерапрыемства. Падкрэслю, як важна, нягледзячы на ўсе складанасці, праводзіць яго рэгулярна, каб кожны сезон атрымліваў адпаведны вынік, каб нашы тэатры ведалі, што іх праца, у рэшце рэшт, ацэньваецца не толькі фінансавымі паказчыкамі, але і тымі духоўнымі, мастацкімі напрацоўкамі, без якіх тэатр не можа лічыцца тэатрам.

Звярну ўвагу чытачоў "К" і на тое, што на сайце Міністэрства культуры ўжо зараз можна знайсці ўсю самую "свежую" інфармацыю, якая датычыцца правядзення Другой Нацыянальнай прэміі. Арганізацыйная праца працягваецца, і не выключана, што да часу выхаду газеты з'явяцца дадатковыя падрабязнасці ды ўдакладненні. Ужо зараз можна азнаёміцца і са складам журы (праўда, гэта пакуль толькі праект рашэння, але літаральна днямі ён будзе канчаткова зацверджаны), і, галоўнае, з раскладам паказу конкурсных спектакляў. Так што ўжо сёння чытачы могуць выбраць спектаклі, якія хацелі б паглядзець (а глядзець, лічу, трэба ўсё), і набыць білеты...

# "Рэчавыя доказы" форуму

— Пры правядзенні такога значнага і буйнога мерапрыемства, як Нацыянальная тэатральная прэмія, — адзначае непасрэдны каардынатар праекта Валянціна Сцяпанава, — важны кожны дзень. Але гэты тыдзень аказаўся, пэўна, найбольш насычаным на арганізацыйныя пытанні. На сённяшні дзень, можна сказаць, да правядзення Другой Нацыянальнай прэміі практычна ўсё гатова.

**— А дакладней? Можа, акрэсліце больш падрабязна, што зроблена і што яшчэ запланавана вырашыць...**

— Пасля таго, як былі падведзены папярэднія вынікі і канчаткова сфарміраваўся склад конкурсных спектакляў — намінантаў на прэмію, распачалася праца па складанні раскладу іх паказаў у Мінску. Бо сёлета, як і летась, на сталічных пляцоўках пройдуць усе вылучаныя спектаклі — тэатраў з усёй рэспублікі. Як паказвае практыка, спектаклі рэгіянальных тэатраў, здараецца, выклікаюць яшчэ большую цікавасць з боку сталічных гледачоў, бо гэта нешта яшчэ не вядомае, тое, што можна паглядзець толькі аднойчы. На сённяшні дзень расклад спектакляў ужо зроблены і выкладзены на сайце Міністэрства культуры краіны. Увогуле, лічу, з часам Нацыянальная тэатральная прэмія павінна займець свой асобны сайт, дзе можна было б аператыўна змяшчаць інфармацыю. Практыка паказвае, што такія сайты маюць вялікі попыт у карыстальнікаў Інтэрнэта і, у рэшце рэшт, садзейнічаюць папулярызацыі пэўнай культурнай з'явы.

**— А ці прадугледжана ўласна рэклама?**

— Канешне! Напрыканцы тыдня (можа, нават раней, чым выйдзе газета) з'явяцца і афішы, і рэклама ў метро. Будуць задзейнічаны ўсе каналы распаўсюджвання інфармацыі. Вядома, спадзяванні ўскладаюцца і на журналістаў...

**— А ці будуць створаны для іх умовы?**

— Сёлета распачне сваю працу прэс-цэнтр. Наколькі мне вядома, плануюцца прэс-канферэнцыі ды іншыя сустрэчы з намінантамі, правядзенне аналітычных абмеркаванняў паказаных спектакляў, "круглы стол", прысвечаны напрамкам тэатральнага мастацтва. Ужо падрыхтаваны макет каталога, які таксама вельмі важны пры правядзенні падобных прадпрыемстваў: ён утрымлівае ўсю неабходную інфармацыю і, да ўсяго, застаецца ў гісторыі адным з "рэчавых доказаў".

**— На прэс-канферэнцыі напярэдадні паведамлялася, што будуць запрошаны замежныя госці...**

— Зараз вядуцца перамовы, але ўсё ж такі называць імёны пакуль не буду: не хочацца даваць непацверджаную інфармацыю.

**— Дарэчы, у вас надзвычай багаты вопыт менавіта "лістападаўскі": я маю на ўвазе вашу шматгадовую плённую працу па арганізацыі і правядзенні Мінскага міжнароднага кінафестывалю "Лістапад". Ці дапамагае вам той досвед?**

— Усё, што назапашана ў жыцці, ніколі не бывае залішнім. І зараз, можна сказаць, фарміруецца арганізацыйная каманда, якая, трэба спадзявацца, мае займацца Нацыянальнай тэатральнай прэміяй пастаянна. Толькі пры такім падыходзе можна разлічваць, што ўсё будзе зроблена своечасова. Пакуль жа магу засведчыць, што мы разам з Міністэрствам культуры краіны працягваем працаваць з заснавальнікамі і спонсарамі, намагаемся прадугледзець усе дробязі. Так, да



1 лістапада павінны быць выраблены прызавыя статуэткі. Журы, як было вырашана на адным з апошніх пасяджэнняў Аргкамітэта, мае ўзначаліць Аляксей Дудараў — заслужаны дзеяч мастацтваў краіны, старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў, прызнаны драматург і проста мудры чалавек. Таксама ў складзе журы — па некалькі чалавек ад кожнага тэатра. Дадам, што Аргкамітэту давялося ўдакладняць склад журы, бо згодна з новымі правіламі, там не павінны былі быць тыя, хто намінаваны на прэмію. Таму канчатковы склад судзейскай камісіі вызначыцца толькі пасля зацвярджэння спіса вылучаных спектакляў ды творцаў...

**Распытвала Надзея БУНЦЭВІЧ**
**Фота Юрыя ІВАНОВА**

# Ідэя пра Нясвіж

**Сведчаннем прыхільнага стаўлення Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі да айчыннай культуры станецца прэзентацыя лепшых распрацовак праекта "Сто ідэй для Беларусі", якая адбудзецца ў рамках чарговага Злёту актыву маладзёжных атрадаў аховы правапарадку Міншчыны.**

У прыватнасці, удзельнікі Злёту пазнаёмяцца з праектам "Нясвіж.by: новая гісторыя старога горада" — інфармацыйна-пазнавальным інтэрнэт-парталам, які ў інтэрактыўнай форме распавядае пра гісторыю і сучаснасць сёлетняй Культурнай сталіцы краіны.

Варта адзначыць, што над праектам працавалі навучэнцы Нясвіжскага дзяржаўнага каледжа імя Якуба Коласа — актывісты Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі.

# "...Восень" Турава

**З 25 па 31 кастрычніка ў Магілёве праходзіць кінатыдзень "Тураўская восень", прысвечаны памяці слыннага рэжысёра, народнага артыста СССР, народнага артыста Беларусі Віктара Турава.**

Магілёўцы ганарацца сваім славутым земляком і дбаюць пра тое, каб традыцыйная "Тураўская восень" збірала як мага больш прыхільнікаў ягонай творчасці.

Сёлетні фэст адкрыўся паказам фільма "Праз могілкі", які рашэннем UNESCO ўнесены ў Спіс ста лепшых фільмаў свету пра вайну. Завершыць жа кінатыдзень вечар "Віктар Тураў. Выявіць сябе і час", у якім маюць удзельнічаць народны артыст Беларусі Генадзь Гарбук, аператар, кіназнаўца Канстанцін Рэмішэўскі, акцёр, старшыня Беларускага саюза кінематаграфістаў Віктар Васільеў, дачка майстра — кінарэжысёр Алена Турава, ягоны сын Арцём і тыя, хто ведаў класіка экрана ў дзяцінстве ды юнацтве.

З нагоды "Тураўскай восені" Віктар Васільеў дзеліцца сваімі меркаваннямі пра класіка нашага кінематографа.

— Гэта не рэгіянальная падзея, — кажа ён. — Віктар Тураў — вялікі рэжысёр, якому належыць шэраг кінашэдэўраў. Ягоная творчасць запатрабаваная і сёння, яго фільмы збіраюць гледачоў. Віктар Цімафеевіч пакінуў пасля сябе не толькі творчую спадчыну, але і вучняў, якія доўжаць ягоную працу...

# Мастак мае вучня

**Выкладчыкі Віцебскай дзіцячай мастацкай школы № 1 зладзілі выстаўку работ сваіх калег і іх вучняў са Слуцкай дзіцячай мастацкай школы.**

Мэта праекта: прадставіць вынік працы педагогаў — выпускнікоў мастацка-графічнага факультэта Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.Машэрава — ды абмяняцца досведам.

На выстаўцы экспануюцца работы Гунефы Мацюшэнкавай і яе вучняў, чацвёра з якіх — Ілья Падалка, Алена Левановіч, Зухра Міхайленка і Міхась Дайлідаў — у розныя гады сталі стыпендыятамі спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі. Усяго ў гэтага педагога навучалася і навучаецца 16 стыпендыятаў спецфонду. Сама Гунефа Мацюшэнкава ўзнагароджана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2000 г.) за вялікі ўклад у выхаванне творчай моладзі, а таксама медалём Міжнароднай акадэміі культуры і мастацтваў "У імя жыцця на зямлі" (Масква, 2011-ы).

Праца мастакоў, якія прысвяцілі сябе педагагічнай дзейнасці, як правіла, застаецца ў цяню, хоць клопат гэты — вельмі карпатлівы, патрабуе вялікай цярплівасці, дабрыні і тактоўнасці.

У экспазіцыю ўвайшлі, галоўным чынам, асацыятыўны жывапіс і графіка, а таксама ілюстрацыі да кніг і вершаў. Выстаўку можна пабачыць у галерэі ДМШ № 1 Віцебска.

# Прыз Вінчэнца

**Сярэбраная памятная манета "Міжнародны фестываль мастацтваў "Славянскі базар у Віцебску" атрымала "срэбра" ў намінацыі "Міжнародная прэмія Вінчэнца Паладыя" IX Міжнароднага конкурсу Міжнародная прэмія Vicenza Numismatica ў Італіі.**

Гэтая ўзнагарода была прысуджана Нацыянальнаму банку Беларусі. Журы вылучыла ў беларускай памятнай манеце арыгінальнае адлюстраванне ландшафту Віцебска, рэалістычны і сюррэалістычны паказ сучаснай складанай дынамічнай кампазіцыі.

Чарговая перамога беларускіх памятных манет у гэтым прэстыжным конкурсе сведчыць пра прызнанне ў свеце працы спецыялістаў Нацбанка.

# Абжыванне “ТэАрта”

## Пункт апоры ці адрыву: у пошуках мяжы дапушчальнага

**“ТэАрт” — гэта ўжо брэнд. І вельмі раскручаны. Не толькі таму, што такая гучная і папраўдзе “гаваркая” назва дадзена Міжнароднаму форуму тэатральнага мастацтва, які меў добрага папярэдніка — “Тэатральны тыдзень...” з адным з вядучых банкаў краіны. Сваю славу “ТэАрт” напрацаваў і тымі спектаклямі ды калектывамі, якія яго арганізатары ўключаюць у праграму, і самім правядзеннем фестывалю, адметнай арганізацыяй, дзе ўсё працуе як гадзіннік.**

### Яны — незразумелыя?

У тым, што “ТэАрт” патрэбны як глыток свежага паветра, няма, здаецца, сумневу. Бо бачыць на свае вочы, што робіцца ў суседзяў і ў свеце, заўсёды вельмі важна: як-ніяк, 14 спектакляў 11-і тэатраў з 8-і краін. Прычым спектакляў не абы-якіх, а самых нашумелых, у тым ліку адзначаных узнагародамі, што дае магчымасць правесці паралелі з нашай Нацыянальнай тэатральнай прэміяй.

Праўда, стаўленне да ўбачанага бывае розным. І часам сярод саміх дзеячаў айчыннага тэатра распаўсюджваецца думка: маўляў, няма чаго вазіць да нас “незразумелыя” спектаклі, разлічаныя на замежную публіку. Сама была сведкай таго, як з некаторых паказаў нашы артысты і, што самае крыўднае, рэжысёры — сыходзілі нават не ў антракце, а пасярод дзеі, “карыстаючыся” тым, што многія спектаклі былі пастаўлены без перапынку.

Але тут ужо пытанні не да арганізатараў. Бо яны, наадварот, рабілі ўсё магчымае, каб форум маглі наведаць не адно тэатралы-аматары, але і спецыялісты — цяперашнія і будучыя. На многіх паказах можна было бачыць, як студэнты Акадэміі мастацтваў ды валанцёры займалі прыступкі, рассаджваліся проста перад сцэнай, стаялі ля сцен — і, да ўсяго, вучыліся. Не толькі на сваіх, але і на чужых поспехах ці памылках.

У гэтым сэнсе ўвесь “ТэАрт” можна назваць вялізным майстрам-класам, дзе максімальна сціралася мяжа паміж жывымі класікамі і тымі, хто толькі гуляе — у класікаў ці нават усё яшчэ… у старамодныя класікі, намаляваныя мелам на асфальце. Былі і творчыя сустрэчы (прычым не толькі ў кулуарах, але і ў навучальных установах, нават у глядзельнай зале пасля спектакля), і майстар-класы.

### Арганізатары прадугледзелі ўсё?

Шыкоўны буклет, адметная рэклама. Спраўна працаваў сайт форуму: свежая інфармацыя там з'яўлялася нават не штодзень, а часам і штогадзіна. Ён, можна сказаць, ператварыўся ў дзённік фестывалю, бо ўжо зранку там можна было знайсці і фотарэпартажы з вячэрніх спектакляў, і інтэрв'ю з удзельнікамі. Такую дасканаласць у нас можна назіраць хіба на “Славянскім базары ў Віцебску”. Іншыя ж фестывалі, здараецца, не займаюцца абнаўленнем сайтаў па некалькі не тое што месяцаў — гадоў! А іншыя і ўвогуле іх не маюць.

Вынік такой хуткай ды зладжанай арганізацыйнай працы, здзейсненай Цэнтрам візуальных і выканальніцкіх мастацтваў, быў пацверджаны, да ўсяго, “надзвычайным здарэннем”, падкінутым будаўнікамі. Рамонтныя работы ў Музычным тэатры, дзе павінны былі адбыцца пяць фестывальных спектакляў, зацягнуліся. І літаральна ў апошні момант кіраўніцтву Цэнтра давялося шукаць новыя пляцоўкі, неяк размяшчаць там публіку, што набыла білеты ў іншую залу, урэшце, папярэджваць уладальнікаў білетаў пра гэтыя пераносы. У такіх умовах ніводны з запланаваных спектакляў не сарваўся, усе гледачы паспелі заняць свае месцы. Бо акрамя абвестак усімі магчымымі і немагчымымі сродкамі, уключаючы сацыяльныя сеткі, ля Музычнага тэатра дзяжурылі валанцёры.

Яшчэ адным выпрабаваннем на добрую арганізацыю стаўся перанос спектакля “Персона. Мэрылін” на заўтра, ды яшчэ на дзённы час: выканаўца галоўнай ролі не паспела даехаць. Але “заўтрашняя” зала была не проста паўнюткай, а — перапоўненай.





### Чым не прынада?

Фестываль, да ўсяго, востра паставіў праблему “абжывання” ўсё новых тэатральных памяшканняў. Не толькі такіх, як Палац культуры МАЗа (дзякуючы метро туды можна трапіць даволі хутка), але і такіх, як… “засцэнічная” прастора згаданага ўжо Музычнага тэатра. Спектакль “Персона. Мэрылін” паказваўся са зваротнага боку сцэны, за так званай “жалезнай заслонай”. Гледачы змясціліся амфітэатрам, на спецыяльных станках — накшталт тых, на якіх спявае хор. У тэатры ўсё яшчэ не было электрычнасці, але для гэтага праекта арганізатары даставілі перасоўны генератар. Падкрэслю, што ўсе гэтыя “непрыстасаваныя ўмовы” былі закладзены ўжо самой эстэтыкай спектакля, і ён праходзіў менавіта на той пляцоўцы, на якой і павінен быў адбыцца.

Дарэчы, у заходнееўрапейскіх краінах падобныя залы, “змайстраваныя” без усякага рамонту, узнікаюць у закінутых басейнах, былых заводскіх цэхах, шахтах, іншых вытворчых памяшканнях, часта — за горадам… У нас жа падобную “пляцоўку” ўдалося знайсці толькі ў закуліссі Музычнага. Што ж, тэатр мог бы падумаць, як яму выкарыстоўваць свой “эксклюзіў” і на будучыню. Чым, дарэчы, не “прынада” для моладзі і аматараў эксперыментаў?

Фантазію аўтараў ды пастаноўшчыкаў маглі абудзіць і “расштурхаць” не толькі элементы новага для нас сцэнічна-“зальнага” начыння, але і самі спектаклі. Іх жанравая палітра была, як і заўсёды на такіх форумах, неабсяжнай: ажно да балета ды мюзікла. Наўмысна пазбягаючы рэцэнзій на кожны з іх, звернем увагу на пэўныя тэндэнцыі развіцця тэатральнага мастацтва, якія маглі б быць прыдатнымі і для нашых творцаў.







**Раўнавагу паміж нашым і замежным, трэба спадзявацца, унясе Нацыянальная тэатральная прэмія. Аднак няблага было б канцэпцыйна ставіцца і да фарміравання нацыянальнага складніка, тым больш, што вольныя ад праглядаў вечары — былі. А ўключэнне ў фестывальную афішу аднаго-двух добрых спектакляў (асабліва, калі яны — сталічныя) не патрабавала б аніякіх капіталаўкладанняў. Затое — стала б стымулам для нашых творцаў.**

### “Адхіленне” — “у капеечку”?

Адна з іх — уменне зрабіць спектакль “з нічога”. Можна, канешне, кпіць з таго, што, маўляў, камусьці грошай на духоўнасць не хапае, таму і спектаклі па сваім каштарысе атрымліваюцца таннымі. А можна задумацца пра іншае: як з закладзеных у пастаноўку грошай атрымаць максімальны прыбытак — не толькі эканамічны, але і духоўны. Сярод прывезеных спектакляў хіба італьянскі патрабаваў спецэфектаў, дый “Шэрбургскія парасоны” Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага тэатра “Карамболь” уляцелі пастаноўшчыкам “у капеечку”. Але на тое ён і мюзікл! У астатніх жа спектаклях акцэнт быў зроблены на пастаянныя тэатральныя пераасэнсаванні-“пераўвасабленні”. Там, дзе не схаваешся за багаццем убранства і “цудамі тэхнікі”, патрабуецца папраўдзе фантастычная ігра. Ці такая ж рэжысура, якая не толькі “схавае” артыстычныя нястачы, але і вывядзе іх за эстэтычнае крэда, звярнуўшыся, да прыкладу, да эфекту “адхілення”. У спектаклі “Нічыя доўжыцца імгненне”, прысвечаным тэме яўрэйскага гета, замест выбуху эмоцый нам прапанавалі быццам бы “дыктарскі пераказ”, які, тым не менш, выклікаў выбух эмоцый у гледачоў.

У пастаноўцы “На дне” паводле М.Горкага Тэатра Оскараса Каршуноваса, у познаньскім пластычным “Мінус 2”, пастаўленым харэографам Охадам Нахарынам, было, наадварот, багата інтэрактыву. Прычым не дзеля адно забавы, а яшчэ і з… выхаваўча-асветніцкімі мэтамі. Першы спектакль вымушаў паставіць сябе на месца герояў, пераасэнсаваць не толькі выразы-лозунгі, шчодра раскіданыя па тэксце і адно за адным вынесеныя на спецыяльнае электроннае табло, але і ўласнае жыццё: што ў ім — галоўнае? Другі — запальваў энергіяй руху, якая ўжо сама па сабе, пазбаўленая звыклага “сюжэту”, і ёсць тое самае жыццё.

А ці не натхніла кагосьці з нашых аўтараў крэатыўная “алеаторыка” спектакля “Запалі мой агонь”? Справа не толькі ў тым, што аповед пра заходніх рок-зорак тут сплецены з біяграфіямі саміх акцёраў, ствараючы пастаянныя паралелі, але і ў “мазаічнасці” самой драматургіі: яна быццам складзена з асобных фрагментаў — “імгненняў жыцця”, прычым зусім не ў храналагічным парадку. І толькі сам глядач у фінале здольны “сумясціць” карцінку, каб усё “сышлося”. Пры такіх “зборна-разборных” канструкцыях спектакль можна штораз рабіць новым, складаючы “кавалкі” ў іншай паслядоўнасці, прапускаючы адны, дадаючы другія. Усё — у залежнасці ад аўдыторыі! А прыём, калі аднаго і таго ж персанажа на працягу спектакля іграюць усё новыя артысты, вымушае гледача адчуць сябе ў эпіцэнтры падзей.

### Што ж актуальна?

Сярод самых актуальных этычна-эстэтычных праблем, узнятых форумам, стала таксама мяжа дапушчальнага — і ў стасунках з класікай, і ў сучасным рэпертуары. Арыгінал часам станавіўся нават не “пунктам апоры”, а ўсяго толькі “пунктам адрыву” ад літаратурнай крыніцы, як гэта адбылося, да прыкладу, з шэкспіраўскай п'есай “У буру”. У спектаклях можна было бачыць і цалкам агаленую натуру, прычым не на адно імгненне, а літаральна пастаянна (“Персона. Мэрылін”), і жартоўныя намёкі на фізіялагічныя патрэбы (“Мёртвыя душы”), і іх натуралістычнае ўвасабленне, ажно да ўпарта-паслядоўнай дэманстрацыі, прабачце, чалавечых экскрэментаў (“Аб канцэпцыі Ліку Сына Божага”). Але, як ні дзіўна, пачатковы ўнутраны пратэст атрымліваў канцэпцыйнае тлумачэнне: аўтарам усіх гэтых “жахаў” былі патрэбны менавіта такія выразныя сродкі, каб данесці сваю думку. Замест банальнай пошласці атрымліваўся боль — жудасны і невыносны. Так што ўсё апраўдвае (ці не апраўдвае) талент. Старая ісціна? Можа, і так.

А што ж мы, беларусы? Акрамя нацыянальнай прэм'еры “Ладдзі Роспачы” (*гл. стар. 9 гэтага нумара “К”*), у праграме “ТэАрта” была яшчэ “Амазонія” таго ж рэжысёра, дзе таннасць пастаноўкі, згаданая вышэй, не прывяла, на жаль, да творчага феерверку, нават у рамках асобна акрэсленай “Маладзёжнай праграмы” форуму. Для параўнання “у нас” і “ў іх” — не самы паказальны, шчыра кажучы, расклад. Хаця і без таго артысты нашага Музычнага тэатра могуць зафіксаваць абсалютную перамогу: у мюзіклах яны спяваюць лепш. А наша мастацкая школа можа дадаткова парадавацца за Зіновія Марголіна: без яго сцэнаграфіі расійская пастаноўка мюзікла папросту “развалілася” б.

З аднаго боку, раўнавагу паміж нашым і замежным, трэба спадзявацца, унясе Нацыянальная тэатральная прэмія дэманстрацыяй вылучаных на яе спектакляў. З іншага ж, няблага было б гэтак жа канцэпцыйна ставіцца і да фарміравання нацыянальнага складніка, тым больш, што вольныя ад праглядаў вечары — былі. А ўключэнне ў фестывальную афішу яшчэ аднаго-двух добрых спектакляў (асабліва, калі яны — сталічныя) не патрабавала б аніякіх капіталаўкладанняў. Затое — стала б дадатковым стымулам для нашых творцаў.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**

**Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА**

Камертон

# Развагі пра (раз)мову

## Пасля прэм'еры сімфоніі

**"Беларускі Шастаковіч", — так сказалі пра Дзмітрыя Смольскага, калі вылучалі яго на адну з прэстыжных міжнародных прэмій. І хаця правільней было б казаць "спадкаемец Шастаковіча", гэтае азначэнне найлепшым чынам вызначае не столькі стыль кампазітара, народнага артыста Беларусі, колькі маштабы ягонага ўнёску ў нацыянальную музычную спадчыну. 15-я сімфонія, прэм'ера якой адкрыла 38-ы Міжнародны фестываль мастацтваў "Беларуская музычная восень", — чарговае таму пацвярджэнне.**

Гэты твор чакалі ўсе. Хтосьці — літаральна "са слязьмі на вачах", хтосьці — з непрыхаванай іроніяй і нават сарказмам: маўляў, колькі можна? Усё піша ды піша, а мы яшчэ 14-ю, са зваротамі да Чайкоўскага, не паспелі як след асэнсаваць. І чаго гэта Смольскага ўсё граюць ды граюць, а іншых — не?

Што ж, так яно і ёсць: граюць, таму што ён піша. Сапраўдны прафесіяналізм — рыса, якой, прабачце, пазбавіцца немагчыма. Хіба змяніць сапраўдны — на ўяўны, што майстра ніколі сабе не дазволіць. Але ж многія і сапраўды чакалі гэты твор з непакоем і асцярогай. Бо ледзь толькі музыканты пазнаёміліся з нотамі, як заўважылі ў іх наўмысна ўжытыя абрысы песень савецкай эпохі. І сярод іх — інтанацыі гімна СССР. А што, калі публіка не так зразумее? І будучая прэм'ера пайшла абрастаць чуткамі ды плёткамі… Калі ж сімфонія, нарэшце, прагучала, той, хто ішоў у філармонію стаць сведкай скандалу, застаўся разгублены: маўляў, дзе ж "абяцанае"? А яго і не было. Бо ў Смольскага на першым плане заўсёды застаецца менавіта музычная ідэя, выказаная на музычнай мове, якая і ўзнімае безліч трактовак, нададзеных ёй выканаўцамі і слухачамі. І чарговая 15-я сімфонія, колькі ні гаварылі б пра асэнсаванне ў ёй кампазітарам савецкай эпохі, сталася, найперш, своеасаблівым даследаваннем этымалогіі тагачаснай музычнай лексікі, імкненнем выявіць у ёй агульначалавечыя, "вечныя", пазачасавыя элементы і — часовыя, выкліканыя пэўнай ідэалогіяй.

Ці ж не пра гэта — усе сімфоніі майстра? Калі ў сучасным мастацтве постмадэрна ідзе пераасэнсаванне тэкстаў, дык Смольскі нанова асэнсоўвае ўнутраны змест саміх інтанацый. Таму ягоныя сімфоніі — заўсёды размова: салістаў з аркестрам, кампазітара са слухачамі. Размова — самае ёмістае для яго творчасці слова яшчэ і таму, што ў ім схавана патаемная канструкцыя: раз — мова. Два — мова. І тры — таксама.

Вось чаму ён так любіць выкарыстоўваць цытаты, "гуляючы" з іх напаўненнем: у іх — ключык не толькі да кідкіх знешніх зместавых пластоў, але і да ўнутраных выкарыстаных шэрагаў, у кожнага — сваіх. Такі прыём у яго творчасці можа ўспрымацца як працяг традыцый не адно Альфрэда Шнітке, але і… беларускай сімфанічнай музыкі даваенных часоў, пабудаванай па прынцыпе: пра што ў згаданай песні спяваецца, пра тое і ў сімфоніі распавядаецца. Але ж — якая вялізная розніца! У той жа 15-й сімфоніі ніводная з цытат не пададзена "ў поўны рост" — хіба асобнымі штрыхамі, што складаюцца ў знаёмыя абрысы. Абсалютна класічная схема чатырохчасткавага сімфанічнага цыкла, дзе пасля гераічнай першай часткі ідзе павольная другая, потым — скерца, а ў фінале з'яўляюцца рэмінісцэнцыі першай, напаўняецца новым сэнсам: монстры нашкталт сталінізму нараджаюцца са зморку, калі розум спачывае. А хуткаплынная частка — сведчанне не толькі імклівасці нашага часу, але і недасказанасці, калі кожны са слухачоў можа дадумваць сваё развіццё музычных падзей.

У выкананні твора Дзяржаўным акадэмічным сімфанічным аркестрам Беларусі, за пульт якога ўстаў мастацкі кіраўнік Дзяржаўнага камернага аркестра Яўген Бушкоў, адчувалася грандыёзная папярэдняя праца. Музыканты вельмі сур'ёзна паставіліся да прэм'еры і творчага вечара кампазітара цалкам. Новай сімфоніі папярэднічала Арыя Любкі з "Сівой легенды", праспяваная Крысценціяй Стасенка, і Фартэпіянны канцэрт — гэтым разам у выкананні Юрыя Блінова. Дадзены твор, напісаны ў 1996 годзе, гучаў ужо двойчы, але з іншымі салістамі. Цяперашняя інтэрпрэтацыя на чале з Аляксандрам Анісімавым, які і ўзначальвае наш сімфанічны аркестр, атрымалася найбольш цэласнай: усе часткі "мазаікі", уключаючы "спасылкі" на Бетховена, Гершвіна, Джопліна, Ліста, Расіні, Чайкоўскага, Шапэна, Шастаковіча, пуантылізм і элементы інструментальнага тэатра, склаліся ў цэласнае палатно, аб'яднанае аўтарскай тэмай, што пабудавана на мінімалістычным "разрастанні" гукараду. Наш знакаміты піяніст, які ўжо некалькі гадоў жыў і працаваў у Амерыцы, граў на памяць, што дапамагала яму цалкам засяродзіцца на філасофскіх глыбінях гэтай шмат у чым аўтабіяграфічнай партытуры.

Адзінае — надта хутка скончыўся вечар. Дык калі можна будзе пачуць тую ж 15-ю сімфонію зноў?..

**Надзея БУНЦЭВІЧ**

Мастыхін

# Акварэльны "востраў скарбаў"

## Абстраганая гармонія па версіі Віцебскай школы



Ф.Гумен. Нацюрморт з кветкамі.

**У Нацыянальным мастацкім музеі працуе ўнікальная выстаўка, прысвечаная 70-годдзю выдатнага мастака Фелікса Гумена. На ёй прадстаўлены акварэльныя творы і самога майстра, і некаторых ягоных вучняў, каму ён даў крылы на мастацка-графічным факультэце тагачаснага Віцебскага педагагічнага інстытута імя С.М. Кірава.**

Няма нічога дзіўнага ў тым, што апошнія тры дзесяцігоддзі пануе "Віцебская школа акварэлі" асацыіруецца перш за ўсё з акварэльным жывапісам Фелікса Фёдаравіча.

Вось яны, яго верныя вучні, талент якіх сёння прызнаны не толькі ў Беларусі, але і ў замежных краінах, дзе экспанаваліся іхнія работы: Мікалай Аўчыннікаў, Людміла Воранава, Уладзімір Рынкевіч, Фёдар Кісялёў, Валянціна Ляховіч, Уладзімір Напрэенка, Алена Сеслікава, Уладзімір Шапо, Міхаіл Міронаў, Валерый і Міхаіл Свістуновы. Гэта толькі малая частка тых "птушанят гнязда Гуменава", хто сёння годна прадстаўляе беларускую нацыянальную школу акварэлі.



В.Свістуноў. "Прывітанне, птушкі!".

Што і казаць, Фелікс Гумен — з'ява ўнікальная. Ён выклікае да сябе інтарэс і ў асяродку ўласна акварэлістаў краіны, і між графікаў, жывапісцаў, і ў маладога пакалення мастакоў, якія рашуча адмаўляюцца ад стандартна-традыцыйнага шляху. Такая аднадушнасць тлумачыцца выключным талентам Гумена, своеасаблівасцю спасціжэння законаў пластыкі і патрэбай гаварыць мовай мастацтва нашага часу. Не ставячы ся з асаблівым піетэтам да класікаў (хаця сярод яго любімых мастакоў — М.Урубель і С.Герасімаў), Гумен смела і свабодна ішоў да выяўлення тых унутраных рытмаў жыцця, якія былі ўласцівы яму ад прыроды. Менавіта патрэба выйсці яшчэ ў 1960 — 70-я гады з кола звычнага жывапіснага мыслення, знайсці свой шлях да выяўлення сучаснай гармоніі свету штурхала яго на пошукі абстрагаванай формы, мовы, новай "карціннай" манументальна-прасторавай кампазіцыі, у якой штодзённыя рэчы і пейзажныя матывы гарадоў ды вёсак артыстычна пераўтвараліся ў сімвалы часу.



М.Аўчыннікаў. "У кругазвароце абнаўлення III".

Вось ужо шмат гадоў Фелікс Фёдаравіч прысвячае свае творы прыгажосці жыцця і побыту, каб паведаміць нам пра "норавы ды характары" таго, што мы звычайна не заўважаем. Сфарміраваны свет акварэльных карцін мастака — апірышча надзейнасці, трываласці, дзе прывольна і дрэвам, і травам, і нябёсам, дзе ўтульна "жывецца" і кветкам, і садавіне, і прадметам хатняга ўжытку, і гарадской архітэктуры. Позірк гледача не спатыкаецца тут на кожным кроку з-за вострых вуглоў запазычаных ці спісаных з рэпрадукцый форм, не блукае ў стракатасці ды ў нагрувашчванні прадметаў і рэчаў. Гэта асабісты, "выпакутаваны" ў шматлікіх акварэльных пленэрах ды вандроўках па Беларусі і замежных краінах, мікракосм мастака, дзе немагчыма "правяраць алгебрай гармонію". Увесь сакрэт гуменаўскіх "штудый" вось у чым: наколькі, часам да наіўнага, спрошчана схема канструкцыі, настолькі ж неэлементарны змест вобраза, адчувальны багаты рытмічны і каляровы пачатак.

Здаецца, адбылося неверагоднае, немагчымае: сама прырода за ўчэпістасць позірку паднесла Гумену падарунак — "арганізаваную" плоскасць і глыбіню, "гатовыя" згоды рытмаў, плям і каляровыя тэмы з варыяцыямі. Але як адбіліся, выявіліся інтуітыўная кампазіцыйнасць, здольнасць бачыць гармонію ў пабудове прыроды і рэчаў — гэта таямніца аўтара, яго "востраў скарбаў", і не будзем спрабаваць яго адкрыць. Урэшце, усё сапраўднае мастацтва — таямніца. Тут для нас важны вынік — арганічнасць твора, дзе прыём не агалены, "зробленасць" адыходзіць углыб, і захапляюць толькі адкрытая эмацыйнасць, пачуцці мастака ды жыццё, што цячэ ў маленькіх, але такіх значных сусветах…

Самае цікавае яшчэ ў тым, што Фелікс Гумен як настаўнік ніколі не прымушаў сваіх выхаванцаў рабіць "пад сябе" (кшталту "малюй, як я!"), а вучыў іх не толькі разумець спецыфіку матэрыялу ды тэхнічных прыёмаў акварэльнага пісьма, але і мысліць самастойна, не азіраючыся на класікаў. Таму ўсе яго паслядоўнікі такія таленавітыя "індывідуалісты" — розныя, яскравыя, незалежныя, цалкам свабодныя ў выбары тэм і сюжэтаў. Аднойчы Фелікс Гумен прамовіў: "Я свабодны мастак, і застануся ім назаўсёды!" Магчыма, гэта галоўнае, што ён спавядае на працягу свайго амаль 50-гадовага творчага жыцця…

**Барыс КРЭПАК**



А.Пяткевіч. Нацюрморт са зброяй.

# Як стрэл у "дзясятку"…

## "Арсенал" мастака — гэта…

**У галерэі "Мастацтва" Беларускага саюза мастакоў працуе персанальная выстаўка жывапісца Андрэя Пяткевіча "Збройная палата".**

На маю думку, экспазіцыі больш пасуе назва "Арсенал", бо Збройная палата — гэта музей, дзе ўласна зброя складае толькі частку агульнай калекцыі. Між тым, на дадзенай выстаўцы яна — галоўны чыннік і сэнсавы стрыжань: на ўсіх карцінах Пяткевіча не проста прысутнічаюць, але прыцягваюць увагу прылады, якія страляюць, рэжуць, колюць. Яны належаць да розных эпох і маюць розную "нацыянальнасць", аднак агрэсіўная канфігурацыя як выяўленне функцыі і родавы знак яднае старажытны ятаган і сучасную штурмавую вінтоўку. Аўтар знаходзіць для кожнай такой прылады ўласны, які адпавядае менавіта ёй, візуальны кантэкст: нацюрморт, партрэт, краявід.

Цікава, што нават архаічныя ўзоры зброі ўспрымаюцца на карцінах Андрэя Пяткевіча не музейнымі рарытэтамі, якія "рукамі кранаць нельга", а, так бы мовіць, жывымі істотамі. Гэткаму бачанню спрыяе і разняволеная жывапісная манера аўтара. Ды ўвогуле, работы Пяткевіча — гэта найперш якасны жывапіс: мастак дэманструе ўменне працаваць з колерам, будаваць кампазіцыю.

Відаць, гэтая выстаўка будзе мець поспех у мужчынскай часткі глядацкай аўдыторыі: схільнасць моцнай паловы чалавецтва ва ўсіх узростах захапляцца "гульнёй у салдацікі" даўно ўвайшла ў показкі ды выслоўі. Адчуваецца, што і сам аўтар у пэўным сэнсе "хворы на зброю": ён малюе яе з такой жа замілаванасцю, як іншыя творцы — агаленых натуршчыц. Пры гэтым мастак мае пастаўленае вока і цвёрдую руку, як снайпер, кожны стрэл якога — у "дзясятку".

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ**

Тэатральная плошча

**Нацыянальная прэм'ера, міжнародны фестываль — падзеі, ужо самі па сабе значныя ў культурным жыцці краіны. А калі гэтыя дзве з'явы з'яднаць, ды не засланіць адно адным, а разам вывесці ў свята грамадскіх пражэктараў? Менавіта так адбылося з "Ладдзёй Роспачы" паводле Уладзіміра Караткевіча, прэм'ера якой вянчала Міжнародны форум тэатральнага мастацтва "ТэАрт".**

# "Ладдзя..." без роспачы



Фота Аляксандра ДЗМІТРЫЕВА

Паставіць новую работу маладога беларускага рэжысёра ў якасці "замыкаючай" цэлую повязь нашумелых і ўжо сусветна прызнаных спектакляў — вядома, рызыка. Калі ж гэта не проста спектакль эксперыментальнай "маладзёжнай праграмы" форуму, а праект, фінансава падтрыманы Міністэрствам культуры Беларусі, — рызыка ўдвая. А яшчэ па канцэпцыйна складанай прозе У.Караткевіча — адназначна, утрая.

Прызнацца, на прэм'еру я ішла ў стане сапраўднай роспачы: а што, як усё гэта замест гармоніі нацыянальнага з еўрапейскім толькі развядзе два складнікі "па розныя бакі барыкад"? Вось, маўляў, замежныя дасягненні — а вось, для параўнання, нашы спробы... Параўнання, хочам мы таго ці не, не пазбегнуць. Але сыходзіла я з прэм'еры — без роспачы, бо спектакль, адназначна, не павінен застацца "фестывальна-конкурснай работай", пазбаўленай пастаяннай сцэнічнай пляцоўкі. Ён мог бы, без перабольшання, упрыгожыць рэпертуар Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы: не толькі дзякуючы беларускай тэме ды ўдзелу некаторых артыстаў-купалаўцаў, але і таму, як тая класіка прачытана і якія нечаканыя амплуа адкрыты ў выканаўцаў.

Відавочна, што аднаму з галоўных ініцыятараў пастаноўкі — аўтару інсцэніроўкі і рэжысёру Ігару Пятрову патрабавалася менавіта такая "некаралевістая", зусім не ўладарна-валявая каралева Бона — простая ды мудрая жанчына, якая ўвесь свой боль трымае ў сабе (Тамара Міронава). Яе "паядынак" з Гервасіем Вылівахам вырашаны як раскручванне-закручванне клубка, на другім канцы якога — пятля. Гэты, здавалася б, просты і не ўпершыню выкарыстаны ў тэатры прыём абрастае разгалінаваным павуціннем асацыяцый: клубок лёсу, дзіцячая гульня ў "рызіначку", нітка, што "нас звязала", нават "колькі вяровачцы ні віцца" ці "пацягні за вяровачку — дзверы і адчыняцца" (у дадзеным выпадку — "дзверы" да сэрца і душы).

У ролі Гервасія, нарэшце, "знайшоў сябе" былы купалавец, а цяпер артыст Маладзёжнага тэатра Андрэй Гладкі. У ім адчуваецца не толькі знешні імпэт, але і, галоўнае, вялікая ўнутраная моц. Абранніцай героя Бярозкай стала актрыса Купалаўскага Юліяна Міхневіч. Таксама цудоўная рэжысёрская інтуіцыя! Артыстка і не "іграе" наўмысна нічога, у яе ўжо на самім твары быццам "напісана": верная жонка і, амаль паводле А.Пушкіна, "дабрадзейная маці".

Успрымаецца спектакль і сапраўдным бенефісам знанага купалаўца Аляксандра Падабеда. Пры ўсёй безлічы сыграных ім роляў, гэтая — лепшая. І нават не "гэтая", а "гэтыя", бо Смерць увесь час паўстае ў розных абліччах. Спачатку — старэнькі дзядок з кіёчкам, быццам прызначаны для "Сымона-музыкі" ці якой-небудзь дзіцячай казачкі. Потым — капрызлівая дама бальзакаўскага ўзросту. Блазан у атачэнні "скамарохаў"-памагатых, чымсьці блізкі Кашчэю Бессмяротнаму. Эстрадная "зорка", што дарвалася да мікрафона. Быццам бы "прыстойны" мужчына ў строгім фраку. А ўсё разам — Джокер, які сышоў з картаў і, адначасова, фільмаў жахаў.

Такой жа шматаблічнай выглядае сцэнаграфія (мастак — Вольга Мацкевіч). Так званы чорны кабінет дапоўнены-"ўдасканалены" формай трапецыі і шэрымі "разрэзамі" куліс па баках, дзе часам дэманструецца відэа: і беларускія краявіды, і, у час шахматнай гульні, — графічныя "заломы", што нібыта адлюстроўваюць зігзагі думак. У гэтай сістэме каардынат рэальнасцю "залюстэрчча" становяцца вялізныя квадраты, якімі гуляюцца артысты пантамімы (студэнты Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў): з аднаго боку — люстэркавыя, з другога — чорна-белыя, ствараючы ў спалучэнні фрагменты шахматнай дошкі.

Дый у самім спектаклі быццам спалучаны два. Адзін — казачна-гістарычны, з акцэнтам рамантызаванай побытавасці. Другі — уласна філасофскі, з ухілам у міфалогію ды сімвалізм. Іх удала яднае кветка-шыпшына: і як вобраз роднай Беларусі, "падгледжаны" ў Караткевіча, і як музычна-песенны лейтматыў (зноў-такі, на вершы аўтара "Ладдзі...", змешчаныя ўнутры празаічнага аповеду). Але ўсё роўна — сапраўднага сінтэзу, што вядзе да вытрыманай стыльнасці пастаноўкі, на жаль, не атрымліваецца. Гэтак жа, як не ўзнікае стыльнасці гукавой аўры спектакля: усе рознанакіраваныя музычныя тэмы маглі б паходзіць са згаданай "песні-кветкі", што пранізвае спектакль рознымі варыянтамі свайго гучання. Дый пластычнае рашэнне (харэограф — Майк Партуш з Францыі) магло б быць больш сучасна крэатыўным, а не нагадваць пастаноўкі пластычнага тэатра "Жэст" пачатку 1980-х. Тады, магчыма, можна было б і папраўдзе сакцэнтаваць, чаму ўсё-такі Вылівaха перамагае Смерць. Не толькі з-за кахання, прагі да жыцця і таму, што гуляе "не па правілах", а таму, што не падпарадкоўваецца агульнапрынятаму, шукаючы свой уласны шлях і непаўторнасць, як гэта было ў Караткевіча.

Пры такім дваістым "раскладзе" залішняй успрымаецца сцэна вяртання героя ў рэальнасць. Яна рэзка зніжае ўздзеяннне кульмінацыі — перамогі над Смерцю, калі выратаваныя Вылівахам пакутнікі дораць яму і Бярозцы гады і хвіліны свайго жыцця. Можа, ёсць сэнс крыху дапрацаваць фінал, канчаткова выявіўшы "казачны гістарызм" у сімвалічна-філасофскую прастору? Але і ў цяперашнім выглядзе спектакль — бясспрэчная перамога на шляху пашырэння нацыянальнага рэпертуару.

**Надзея БУНЦЭВІЧ**



Джокер з кіёчкам супраць "ружы-шыпшыны"

Фота Тацціяны МАТУСЕВІЧ

**29 кастрычніка, быццам папярэджваючы Мінскі кінафестываль "Лістапад", у кінатэатры "Цэнтральны" будзе прэзэнтавана новая, амаль гадзінная, стужка "Беларускі балет: гісторыя". Яе стварылі на "Беларускім відэацэнтры".**

# Балет у рапідзе

## Свой "Лістапад": танцавальная класіка з XVIII стагоддзя

Старонкі нашага музычна-танцавальнага мінулага — далёкага і блізкага — нарэшце, ажылі. Аўтары пачынаюць аповед з сярэдзіны XVIII стагоддзя, калі сярод айчынных магнатаў шырока распаўсюдзіліся прыватныя оперныя тэатры. А колькі сцэн з сучасных спектакляў можна ўбачыць! "Карцінка" на экране — папраўдзе гожая: у аднаўленым Нясвіжскім палацы артысты ўвасабляюць Радзівілаў з іх тэатральнымі забавамі. Выкарыстаны і элементы анімацыі, камп'ютарнай графікі. Дый тэкст "за кадрам", якім суправаджаецца дзея, поўны цікавых звестак і справядлівых гістарычных акцэнтаў (прыкладам, сумленна акрэслены ўнёсак, што зрабіла беларускае балетнае мастацтва ў развіццё польскага і расійскага балета канца XVIII стагоддзя).

Мінулая ж сотня гадоў, аддаленая ад нас куды менш, паўстае праз афішы, фота са спектакляў, дакументальныя відэаздымкі, шматлікія кадры тагачасных "навін культуры". Яшчэ больш поўна ды красамоўна пададзена апошняя трэць XX стагоддзя, звязаная з магутнай постаццю народнага артыста СССР і Беларусі Валянціна Елізар'ева і яго шматлікімі пастаноўкамі. Фільм варты ўхвалы ўжо за адно тое, што справядліва аддае даніну павагі гэтаму найталенавітаму харэографу, праца якога ў тэатры стала асобнай эпохай канцэпцыйна-філасофскіх балетаў.

Перажыўшы эйфарыю ад самой наяўнасці стужкі, выдадзенай на кампакт-дыску, ацаніўшы шырокія магчымасці яе выкарыстання (ад шыкоўнага падарунка да вучэбна-метадычнага дапаможніка), пачынаеш заўважаць дэталі, якія ўсё ж не дазваляюць прылічыць свежаспечаны "кампактны" блінец да шэдэўраў сусветнага мастацтва. Фільм перагружаны тэкстам, і голас Алега Лукашэвіча, вядучага і аднаго з аўтараў сцэнарыя (ён сам у кадры так і не з'явіўся) пачынае асацыіравацца з... чытаннем газет (у дадзеным выпадку, даведніка) у радыёэфіры, як гэта было напрыканцы 1920-х.

Паводле законаў мантажу, любое сутыкненне кадраў (а тым больш — "стыкі" слоў і руху) надаюць убачанаму новы сэнс. Фрагмент цяперашняга "Шчаўкунка" з павальным "палётам" пад каласнікамі, узнікшы ў час аповеду пра XVIII стагоддзе, успрымаецца папраўдзе вельмі дарэчы: тагачасная эстэтыка была схільная да падобных тэатральных эфектаў, і рэжысёр Руслан Макараў убачыў яе сучасны працяг. Такім жа дакладным трапляннем уяўляецца "пераможны салют" фантана пасля слоў пра неабмежаваныя тэхнічныя магчымасці нашага Вялікага тэатра. Ды ўсё ж стасункі паміж відовішчам, словам і музыкай у новым фільме часам нагадваюць байку пра Лебедзя, Рака ды Шчупака.

Размова пра нацыянальны танцавальны фальклор, стварэнне балетнай студыі, пастаноўку "Чырвонага мака" М.Гліэра — усё "пакладзена" на мелодыі з "Кармэн" Ж.Бізэ, якія становяцца чымсьці накшталт "лейтматыву" стужкі. Ледзь не пастаянна згадваецца і "Лебядзінае возера" П.Чайкоўскага. Але да ўзроўню ніткі Арыядны, што вывядзе з гістарычнага лабірынта, гэты прыём не дацягвае. А між тым, народная артыстка Беларусі Вольга Гайко, дзякуючы паўторам у рапідзе, удала выведзена на абагульнена-сімвалічную ролю Тэрпсіхоры. Дый гаворыць яна добра! Як і іншыя салісты балета. А чаму б не выкарыстаць думкі не толькі практыкаў тэатра, а яшчэ і даследчыкаў? Можа, тады ўвесь аповед набыў бы рысы не "летапісу пункціраў", а... дэтэктыву, закручанага ў праславутых "32 фуэтэ"?

Раскадроўка




Так што выйсце ёсць. Яно — у працягу. І гэтага фільма, і далейшых балетных пастановак (пакуль жа "адлюстраваннем" мадэрна, пра які распавядае Дзяніс Клімук, становіцца... некласічна-драматычная "Анюта"). І, шырэй, самой гісторыі нашага балетнага мастацтва, у якой усё яшчэ недаравальна многа белых плям падманна-чорных лебедзяў.

Праўда, тады заканамерна паўстае пытанне: а што ж опера? Гэтым тыднем Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета Беларусі распачаў у Камернай зале імя Л.Александроўскай цыкл вечароў "Гісторыя оперы". Аўтарам і вядучым праекта выступіў саліст тэатра і кіраўнік "Беларускай капэлы" Віктар Скорабагатаў — нястомны рупліўца нацыянальнай спадчыны. А ў "Белвідэацэнтры" ёсць планы, што і опера з часам дойдзе да кіно. Ці кіно — да оперы?..

**Н.Б.**

## Культура і інвестар: грані сацыяльнага партнёрства

**Як прывабіць сваімі праектамі спонсараў? Вырашэнне названай задачы, мяркуючы па шматлікіх выездах у рэгіёны краіны, выклікае вялікія пытанні ці не ў кожным аддзеле культуры. І справа тут не толькі ў слабой матэрыяльна-тэхнічнай базе або нездавальняючай кадравай сітуацыі. Аб'ектыўная прычына таго, што ў тым або іншым раёне Беларусі слаба наладжана сацыяльнае партнёрства, бывае і досыць празаічная: тут можа быць не так шмат буйных прадпрыемстваў — як дзяржаўнай, так і прыватнай формаў уласнасці, — таму і ўстанаўліваць узаемакарысныя сувязі фактычна не заўжды ёсць з кім… А малы бізнес, на жаль, пакуль не надта ахвотна ідзе на кантакт з аддзеламі культуры. Ёсць, натуральна, прыклады і адваротныя, але ж іх не так многа, як хацелася б.**

**У Асіповіцкім раёне Магілёўскай вобласці мясцовыя культработнікі і базу маюць неблагую, і кадравы складнік у аддзеле культуры — на вышыні. Што да буйных прадпрыемстваў, дык іх у раёне — больш чым дастаткова. І самае галоўнае: кожнае з іх дапамагае тым або іншым чынам развівацца сацыяльнай сферы Асіповіччыны. У тым ліку, натуральна, і культуры.**

**А ўсё таму, што ў аддзеле культуры Асіповіцкага райвыканкама ўжо даўно ўсвядомілі важнасць ды неабходнасць працы са спонсарамі. І вядомая прыказка "Хто дбае, той і мае" для мясцовых культработнікаў — інструкцыя да дзеяння. Таму апошнім часам тут завязалі шчыльныя кантакты з многімі кіраўнікамі раённых прадпрыемстваў і арганізацый як дзяржаўнай, так і прыватнай формаў уласнасці.**



Новы будынак Асіповіцкага раённага музея.

### Паляцець у Стамбул? Ды калі ласка!, або Рэальныя вынікі праектнай дзейнасці Асіповіччыны

# Як спонсар павялічыў

### Прынцып талакі

Аддача ад падобных кантактаў — навідавоку. Напрыклад, ААТ "Кроўля", дырэктарам якога з'яўляецца Мікалай Калтуноў, спрыяе культработнікам у правядзенні шматлікіх мерапрыемстваў, набываючы прызы ды каштоўныя падарункі для ўдзельнікаў і фіналістаў раённых конкурсаў. А калі паўстала пытанне фінансавання паездкі калектыву Асіповіцкай ДШМ № 1 на Міжнародны фальклорны дзіцячы фестываль у сталіцу Турцыі, дык прадпрыемства выдаткавала значную суму грошай на авіябілеты для пералёту ў Стамбул.

Прычым асіповіцкім падлеткам дапамаглі грашыма і іншыя раённыя дзяржаўныя і прыватныя прадпрыемствы: "Асіповічыгазбуд", "СіціГолд Груп", "Тандэм"… І сумесная спонсарская праца ўсёй, так бы мовіць, прадпрымальніцкай "талакой" не засталася безвыніковай: у сталіцу Турцыі паляцелі 20 чалавек!

Дадам, што выступленні ўзорнага харэаграфічнага ансамбля "Крынічка" з далёкай Беларусі небеспадстаўна выклікалі вялікую цікавасць у жыхароў турэцкай сталіцы. А ў саміх Асіповічах пасля гэтага адзначылі прыток ахвотных займацца ў дзіцячых школах мастацтва райцэнтра. Гэтую тэндэнцыю заўважылі ў аддзеле культуры мясцовага райвыканкама па завяршэнні сёлетняй прыёмнай кампаніі. Зразумела, найбольш ахвотных аказалася запісацца на заняткі харэаграфіяй… Вось такім, даволі простым, чынам мясцовыя культработнікі не толькі вырашаюць матэрыяльныя пытанні, але і ўплываюць на развіццё духоўнага жыцця Асіповіччыны.

### "Праектаўтваральная" база

Названая агульнараённая спонсарская ўвага ды падтрымка сацыяльнай сферы адсочваецца і ў іншых праектах. Па словах начальніка аддзела культуры Асіповіцкага райвыканкама Ірыны Раманчук, пры правядзенні ўсіх агульнараённых мерапрыемстваў абавязкова прыцягваюцца значныя грашовыя сродкі спонсараў. Да прыкладу, прыватнік дапамог з арганізацыяй феерверку на Дзень горада, а амаль усе прадпрыемствы горада праспансіравалі выданне кнігі "Асіповічы: гісторыя і сучаснасць", якая выйшла днямі ў адным з мінскіх выдавецтваў. А, скажам, Асіповіцкі лясгас ды яго ны кіраўнік Мікалай Раўбель дапамагаюць культработнікам з афармленнем падворкаў на разнастайных рэспубліканскіх, абласных і раённых святах…

Галоўная база, дзе шліфуюцца творчыя праекты мясцовых крэатыўшчыкаў, — гэта, натуральна, сцэнічныя пляцоўкі асноўных устаноў культуры горада. Так, даволі шмат акцый рэалізавана ў Асіповіцкім РЦК пры самым непасрэдным удзеле інвестараў і мецэнатаў. І гэта не толькі звыклыя вечары-карпаратывы ці арганізацыя прафесійных святаў. Шмат спонсарскай дапамогі атрымалі культработнікі, напрыклад, пры правядзенні праектаў "Міс Асіповічы" ды "Містэр Асіповічы". Арганізацыю іх узялі на сябе супрацоўнікі РЦК. А вось прызавы складнік быў аддадзены, так бы мовіць, на водкуп спонсарам.

Але ўдзел прыватнікаў не абмяжоўваўся адно толькі ўзнагародамі. Так, касцюмы для канкурсантаў бясплатна прадаставілі ў мясцовым салоне вячэрніх сукенак. Зразумела, такі крок не застаўся без увагі культработнікаў: дырэктар салона Наталля Марчанка была запрошана ў журы конкурсу.

А летась падтрымку названаму мерапрыемству аказаў таксама і вясельны салон "Вянец" ажно з Заслаўя, які прадаставіў удзельніцам прыгожыя строі для дэфіле. Да таго ж, вядомае мінскае прадпрыемства "Белімпартфутра" ў якасці рэкламы сваёй прадукцыі дало магчымасць кожнай з удзельніц прайсціся па подыуме ў футрах — узорах сваёй прадукцыі.

Падтрымка не спыняецца і цяпер. Напрыклад, праз некаторы час заканіты ў краіне вытворца чыпсаў выступіць спонсарам пры правядзенні мерапрыемства, прымеркаванага да Дня інвалідаў…

Свае цікавыя акцыі, якія маюць пастаянную падтрымку спонсараў, ладзяцца і ў Маладзёжна-падлеткавым цэнтры "Равеснік". Гэта фэст альтэрнатыўнай музыкі "Анты-поп", рэгіянальны фестываль па брэйк-дансе ды многія іншыя праекты. Да таго ж, дзякуючы мясцовым прадпрымальнікам, тут маюць магчымасць набываць касцюмы для эстраднага калектыву "Крышталь" ды выязджаць на гастролі ва Украіну. А ўсё таму, што кіраўнік "Крышталя" Аксана Мысюціна можа не толькі зацікавіць сваімі праектамі спонсара, але і якасна запісвае ды агучвае здымкі тых мерапрыемстваў, якія ладзяцца на базе "Равесніка". Таму кожны кіраўнік гарадскога прадпрыемства разумее: сябраваць з Аксанай Валянцінаўнай — вельмі карысна. Асабліва калі ўлічыць, што іншых прафесійналаў гуказапісу на Асіповіччыне папросту няма…

Інакш кажучы, у Асіповічах паспяхова ўкараняюць у сваю паўсядзённую клубную дзейнасць прынцыпы дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва. Што і казаць, у гэтым мясцовыя супрацоўнікі могуць даць сто працэнтаў перавагі іншым сваім калегам з некаторых рэгіянальных аддзелаў культуры Беларусі. Прычым названая станоўчая сітуацыя склалася не толькі таму, што ў Асіповічах маецца значная колькасць прамысловых прадпрыемстваў, а і таму, што культработнікі ўдала сумяшчаюць у сваёй дзейнасці прынцыпы маркетынгу і мерчандайзінгу: не толькі ствараюць удалыя праекты, а і паспяхова зацікаўліваюць імі патэнцыйных спонсараў. Вынікі, на мой погляд, — даволі неблагія.

### Са спонсарам — да кірмашу

Але падобныя прыклады паспяховага дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва маюцца не толькі ў райцэнтры, а і ў сельскай мясцовасці, да прыкладу, у аграгарадку "Вязаўніца". Дырэкцыі мясцовага клуба дапамагае спецыялізаванае сельскагападарчае прадпрыемства: філіял "Белшына-агра" ААТ "Белшына", якое стапася спонсарам "Свіслацкага кірмашу", зладжанага мясцовымі культработнікамі ў паселішчы днямі, а таксама выдаткоўвае падарункі на разнастайныя гульнёвыя праграмы, што ладзяцца клубнікамі. А яшчэ прадпрыемства пастаянна выкупляе білеты на канцэрты СДК і ніколі не адмаўляе супрацоўнікам клуба ў транспартных паслугах.

Але не варта думаць, што гэтая спонсарская дапамога не мае аддачы. Культработнікі, натуральна, заўсёды запрашаюць супрацоўнікаў "Белшына-агра" на свае мерапрыемствы, выязджаюць з канцэртамі ў поле… І фактар з немалаважных: многія супрацоўнікі прадпрыемства з'яўляюцца ўдзельнікамі народнага хору "Чыстыя крыніцы", які дзейнічае пры СДК…

Ва ўдалай працы з мясцовым спонсарам — немалая заслуга дырэктара Вязаўніцкага СДК Валянціны Ліхадзіеўскай. Яна, дарэчы, узначальвае ўстанову цягам вось ужо 25 гадоў. Сама ж Валянціна Андрэеўна працуе ў сферы культуры ні многа ні мала — ужо 48 гадоў! Менавіта дзякуючы яе актыўнай пазіцыі культработнікі заўсёды маюць падтрымку ў кіраўніка прадпрыемства ды радуюць жыхароў паселішча яркімі мерапрыемствамі. І гэта не толькі традыцыйныя святы вёсак або тэматычныя дыскатэкі, але і, да прыкладу, правядзенне Масленкі, на якое таксама было атрымана шмат спонсарскіх грошай…

Зусім нялішнім будзе сказаць пра тое, што вопыт Валянціны Ліхадзіеўскай з'яўляецца адной з галоўных прычын актыўнага прыцягнення спонсарскіх сродкаў.

### Камп'ютар — у кожнага супрацоўніка

Сяло, як ужо казаў, не адстае ад горада ў прыцягненні спонсарскіх сродкаў. І ў першую чаргу — за кошт тых цікавых праектаў, якія ладзяць тут мясцовыя культработнікі. Напрыклад, у аграгарадку "Вяззе" адносіны са спонсарамі здаўна былі трывалымі ды выніковымі. Прычына — досыць банальная: "жывая" капейка, як прызнаўся дырэктар Вяззеўскага СДК Мікалай Забаўскі, нікому не шкодзіць. Нават кіраўніцтву таго клуба, які не мае асаблівых праблем з матэрыяльна-тэхнічнай базай сваёй установы. Таму Мікалай Забаўскі прыярытэты ў сваёй дзейнасці вызначыў даўно. І выезды з узорнай эстраднай студыяй "Хваля" ці то ў санаторый "Свіслач", ці то ў суседні дзіцячы аздараўленчы летнік з канцэртамі яшчэ колькі гадоў таму сталіся тут завядзёнкай.

На заробленыя грошы культработнікі закупілі камп'ютары для кожнага супрацоўніка СДК — ажно чатыры адзінкі, — набылі найноўшую гукаўзмацняльную і гуказапісваючую

### Галерэя спонсараў ад "К"

## Прыярытэты самадастатковага бізнесмена

**Вялікая спонсарская падтрымка ўсіх пачынанняў мясцовых культработнікаў зыходзіць, як ужо казаў, ад многіх прадпрыемстваў. Адно з іх — ПГУП "Панатрэйд", якое ўзначальвае Наталля ПАХОМЕНКА. Прадпрыемства складаецца з цэлай сеткі прадуктовых крам, што карыстаюцца вялікім попытам у жыхароў Асіповіч. А працуюць у арганізацыі некалькі соцень чалавек. Таму і ўвага да развіцця мясцовай сферы культуры — невыпадковая.**



Наталля Пахоменка.

— Наша падтрымка сацыяльнай сферы вынікае з самой нашай дзейнасці, — кажа Наталля Мікалаеўна. — І я ўпэўнена, што кожны самадастатковы бізнесмен, няхай сабе і рэгіянальнага ўзроўню, павінен клапаціцца ды выдаткоўваць пэўныя фінансавыя сродкі на развіццё тых або іншых праектаў у сферы культуры, адукацыі, здароўя, спорту ці турызму… І адбываецца гэта павінна без прымусу. Мы, напрыклад, так робім пастаянна і не бачым у гэтым ніякага подзвігу ці выключнасці…

**— Ведаю, значныя сродкі былі выдаткаваны для арганізацыі і правядзення ў Асіповічах Дня горада, а таксама вы падтрымліваеце многія праекты культработнікаў, напрыклад, у тым жа РЦК. Што, на вашу думку, перашкаджае развіццю сацыяльнага партнёрства ў раёне?**

— Цягам апошніх гадоў, як мне падаецца, нашыя мясцовыя бізнесмены асэнсавалі тое, што ад наладжанага дзяржаўна-прыватнага супрацоўніцтва выйграюць усе. Таму цяпер вялікіх перашкод у тым, каб дапамагчы таму ці іншаму сацыяльнаму праекту, я, па вялікім рахунку, не бачу. Больш за тое: мясцовыя бізнесмены пастаянна падтрымліваюць акцыі мясцовых культработнікаў. Скажу і пра нашы планы: мы цяпер завяршаем працу над праектам, вынікі рэалізацыі якога не пакінуць абыякавымі жыхароў Асіповіччыны. І аддзел культуры райвыканкама таксама абавязкова будзе задзейнічаны.

**— Маеце на ўвазе адкрыццё ў горадзе дзіцячага кафэ?**

— Так. Справа ў тым, што адсутнасць дзіцячага кафэ ў горадзе — праблема для Асіповіч. Таму мы паспрабуем вырашыць дадзенае пытанне сваімі сіламі. Натуральна, пасля ўвядзення ў строй дзіцячага кафэ мы будзем прыцягваць да ўдзелу ў забаўляльных праграмах названай установы і культработнікаў…

# набор у ДШМ

апаратуру ды многае іншае. Таму і пачувае сябе дырэктар самадастаткова ды ўпэўнена, бо ведае, што заўсёды можа зарабіць грошы для ўсіх надзённых патрэб свайго калектыву. Натуральна, не адмаўляючыся ад спонсарскай дапамогі мясцовай гаспадаркі, якая то з транспартам падтрымае, то выдаткуе грошы на прызавы фонд для правядзення святочнага мерапрыемства, а то і проста накіруе рабочых, каб добраўпарадкаваць прылеглую да СДК тэрыторыю…

Што да творчых праектаў, дык іх ва ўстанове багата. Найбольш цікавы, на мой погляд, — правядзенне аўтэнтычных вясельных абрадаў, якія, да слова, карыстаюцца попытам не толькі ў паселішчы. Галоўную ролю тут адыгрываюць артысты аўтэнтычнага народнага ансамбля беларускай песні "Вязанка", створанага пры СДК. Дзеля названай "дзеі" ў Вяззе завітваюць закаханыя пары і з Асіповіч, балазе паселішча знаходзіцца не так далёка ад райцэнтра.



**Падворак, створаны рукамі спонсара — мясцовага лясгаса.**

Зразумела, падобнымі акцыямі ў сельскіх дамах культуры цяпер нікога не здзівіш, тым не менш, яны ўсё адно папулярныя. Але ж мясцовым культработнікам варта, на мой погляд, паспрабаваць ажыццявіць і яшчэ які-небудзь цікавы праект, напрыклад, звязаны з прыродным асяроддзем, улічваючы, так бы мовіць, "геапалітычнае" становішча СДК, які знаходзіцца на беразе Свіслацкага вадасховішча. Чаму б, напрыклад, не зладзіць тут раённы конкурс рыбаловаў ці рыбны фестываль, арганізаваць катанне на лодках або начное фаер-шоу на вадзе? Упэўнены, гэта прынесла б яшчэ больш грашовых дывідэндаў клубнікам з Вяззя...

Але, па праўдзе кажучы, праблем з выкананнем плана платных паслуг мясцовыя культработнікі даўно не маюць і зараз распрацоўваюць ужо іншыя праекты, здольныя зацікавіць патэнцыйных спонсараў. Таму зусім не здзіўлюся той інфармацыі, што Вяззеўскі СДК сёлета вылучаны на ўдзел у Рэспубліканскім конкурсе "Клуб года-2012". На фоне іншых устаноў Беларусі клуб з Асіповіччыны будзе глядзецца ўпэўнена, а яго праектная дзейнасць вартая таго, каб быць узятай на ўзбраенне калегамі з іншых рэгіёнаў нашай краіны...

Супрацоўнікі сельскіх устаноў культуры раёна могуць, без перабольшання, няблага шчыраваць на спонсарскай дзялянцы. І хаця магчымасцей у іх для гэтага значна менш, чым у культработнікаў з райцэнтра, усё-такі яны здольныя зацікаўліваць патэнцыйнага мецэната правядзеннем незвычайнага сельскага мерапрыемства. Напрыклад, кулінарным фестывалем, тым жа святам рыбалова або арганізацыяй культурна-турыстычных маршрутаў вакол вёскі… Ідэй для рэалізацыі можа быць безліч. Галоўнае ж тут, на мой погляд, не замыкацца ў традыцыйных формах, а — шукаць новае, тварыць і пераасэнсоўваць усё, што стваралася да гэтага. І поспех не прымусіць сябе чакаць...

### Шведская калекцыя

Напрыканцы не магу не распавесці пра тыя змены ў культурным жыцці Асіповіч, якія адбыліся тут літаральна колькі месяцаў таму. Справа ў тым, што летам адкрыў свае дзверы для наведвальнікаў новы будынак раённага Гісторыка-краязнаўчага музея. Раней установа месцілася даволі далёка ад цэнтра горада, што, па словах яе дырэктара Ніны Курыльчык, не надта спрыяла працы: завітвала не так шмат турыстаў і турыстычных груп. Цяпер, пасля пераезду ў новы будынак, установа будзе, натуральна, больш запатрабавана як у жыхароў Асіповіч, так і ў гасцей райцэнтра: балазе ад вакзала да музея — некалькі крокаў.


**Эстрадны калектыў "Крышталь" са сваім кіраўніком Аксанай Мысюцінай.**

Сёння тут поўным ходам ідзе мантаж новай экспазіцыі. Для гэтага з бюджэту раёна выдаткаваны прыкладна 1 мільярд рублёў. Прычым ужо цяпер мясцовыя музейшчыкі маюць чым ганарыцца: аддзел культуры закупіў відэаапаратуру, якая, прыкладам, дазваляе Ніне Курэйчык не сыходзячы з працоўнага месца назіраць за ўсім, што робіцца ў сямі музейных залах ды перад уваходам у музей.

Але ў развіцці сваёй установы музейшчыкі спадзяюцца не толькі на раённыя грошы. Маюцца тут і прыклады паспяховага супрацоўніцтва са спонсарамі ды мецэнатамі. Пра адзін з іх распаведу асобна. Літаральна з дня на дзень у Асіповічах чакаюць грузавы аўтамабіль з калекцыяй, якая ўключае больш за 300 старадаўніх прадметаў… Гэта побытавыя рэчы XIX — пачатку XX стагоддзя: мэбля, посуд, дываны, карціны ды многае іншае. Перадаў іх установе шведскі грамадзянін, праўнук Іосіфа Дараганава — былога ўладальніка сядзібы ў вёсцы Крынка Асіповіцкага раёна.

Даволі часта музейная калекцыя папаўняецца каштоўнымі прадметамі з Брэсцкай ды Гомельскай мытняў: ва ўстанове ўжо сабрана такім чынам вялікая калекцыя беларускіх і рускіх ікон XIX стагоддзя, а таксама нумізматычны збор… Так што і музейныя супрацоўнікі не забываюць пра наладжаную працу з усімі патэнцыйнымі спонсарамі. Тое, што дадзеная практыка сябе цалкам апраўдвае, пераконваць нікога ў Асіповічах, як бачна, даўно ўжо не трэба. А пра выгоды развіцця падобнай дзейнасці для сферы раённай культуры і казаць не варта…

■■■

Установам культуры Асіповіч, як бачна, вельмі дапамагае тое, што ў райцэнтры сканцэнтравана досыць вялікая колькасць буйных прадпрыемстваў. Але ж дайсці да кожнага кіраўніка і зацікавіць сваёй праектнай дзейнасцю таксама трэба ўмець. Асіповіцкія культработнікі даказалі сваёй дзейнасцю, што асабістыя кантакты дапамагаюць вырашаць любыя праблемы, у тым ліку — і фінансавыя.

Але ж не варта, на мой погляд, і спачываць на лаўрах. Наладжаныя кантакты пастаянна трэба падтрымліваць, ствараючы разнастайныя праекты, здольныя зацікавіць спонсараў. І лепш за ўсё, каб мерапрыемствы асіповіцкіх культработнікаў "гучалі" не толькі на раённым, а і на абласным ці рэспубліканскім узроўнях. Балазе база для гэтага маецца як матэрыяльная, так і творчая. І, натуральна, пры такой умове здабыткі ад дзяржаўна-прыватнага партнёрства маглі б быць яшчэ большымі, чым маюцца цяпер.

**Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ,**
**наш спецыяльны карэспандэнт**
**Мінск — Асіповіцкі раён — Мінск**
**Фота аўтара**

## Хэдлайн рэгёна: прыватная ініцыятыва — агульны інтарэс

**Адразу пасля выхаду 41-га нумара газеты "Культура" ў рэдакцыю патэлефанаваў Генадзь Цыганкоў. Не мог стрымацца, узрушаны "соцыумным" разваротам, дзе гаворка ішла пра захаванне-развіццё музея "Малая Бацькаўшчына" Мікалая Тарасюка і ўвогуле пра стварэнне музеяў на сядзібах таленавітых народных майстроў Беларусі, нават пра музеефікацыю асобных вёсак, адметных абліччам і традыцыяй. Гаворка з неабыякавым чытачом і стала нагодай для дадзенай публікацыі.**

# Аўтэнтыка праекта, або Як музеефікаваць малую радзіму?

**Чытач тэлефануе ў працяг тэмы**

Генадзь Васільевіч, як высветлілася, не майстар, не рамеснік, ён — вядучы спецыяліст райметадцэнтра Лёзненскага аддзела культуры. Словам, па вызначэнні — чалавек з перспектыўным мысленнем. Непадалёк ад райцэнтра мае лецішча. Яго ная хата — бадай, адзінае, што засталося ад вёскі Малькава, якая знікла ў выніку з'яднання з паселішчам Якубаўшчына...

Дык вось, у гэтай хаце, узведзенай яшчэ ў 1918 годзе, Генадзь Цыганкоў падумвае стварыць невялічкі этнамузей, які адлюстроўваў бы мінулую эпоху, колішняе жыццё беззваротна зніклага Малькава.

І хата гэтая, цалкам верагодна, стане адным з пунктаў турмаршруту, што звяжа Лёзна, апавітае талентам Марка Шагала, вёску Страганы, дзе пахаваны пісьменнік пазамінулага стагоддзя Аляксандр Рыпінскі, вёску Кавалі, якая пад час Вялікай Айчыннай вайны праславілася партызанскімі подзвігамі. А непадалёк — старасвецкі парк, сажалка...

Як рэалізаваць прыватную ініцыятыву на раённым узроўні? **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 або kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-334-57-23, **абмяркоўвайце** тэму на www.facebook.com/kimpressby і www.twitter.com/kultura_by! Нам важная менавіта ваша думка!

Ініцыятыва метадыста знаходзіцца пакуль у "фармаце" ідэі. Але ідэі, пагадзіцеся, вельмі прывабнай і своечасовай. Аграгарадкі аграгарадкамі, але са знікненнем шараговых вёсак мы губляем частку беларускай душы, што жывіцца сельскім туманным ранкам ды неверагодным пахам саспелых антонавак... Вось для ацалення гэтай душы і марыць Генадзь Цыганкоў зрабіць у вясковай хаце музей — не проста сховішча старадаўніх калаўротаў ды прасаў (а мо і ўвогуле зусім не іх!), а спрыяльны для развіцця сельскага турызму інтэрактыўны асяродак, дзе б ён заставаўся не "анімацыйным" экспанатам, а рэальным гаспадаром, які на справе знаёміў бы турыстаў з вясковым побытам, гасцінна частаваў бы іх уласнымі стравамі ды напоямі па рэцэптах, захаваных ад мамы і бабулі...

І такі "асяродак для душы", па меркаванні культработніка, не павінен нагадваць аграсядзібу з "еўрапеізаванымі" выгодамі. Ніякіх джакузі — толькі лазня "па-чорнаму", ніякіх салонных камінаў — толькі старэнькая грубка з катом-лянгузам ля меха з сушанымі грыбамі! А на сценцы — дзясяткі сямейных фотаздымкаў пад шклом і ў агульнай раме, і за кожным — асобныя лёсы, што сталі лёсам і краю, і краіны... Прызнайцеся, калі вы апошнім разам такое бачылі? Хіба ў далёкім дзяцінстве...

Ёсць, ёсць, перакананы метадыст, аматары і такога аўтэнтычнага адпачынку. Хтосьці з пераборлівых аднясе яго ў разрад эканом-класа, а ў кагосьці залунае над буслянкай душа. Бульба ў сагане, сырадой у глечыку, якому, як і хаце, сто гадоў, пах зёлак у сенцах, ліпавы мёд у кадобчыку... Што яшчэ трэба для адхлання? У такой "хатняй" хаце з задавальненнем спыніцца не толькі турыст, але і рыбак з паляўнічым. Была б толькі рэклама належная.

Так, для Генадзя Цыганкова (яўнага канкурэнта гаспадарам аграсядзіб, дзе збольшага не душой, а целам адпачываюць) яшчэ не зразумелы юрыдычны механізм вось такой музеефікацыі малой радзімы. Ды і ці ёсць той механізм, гарантаваны заканадаўчымі актамі? Дакладна ведаю адно: жадаючых стварыць не толькі хату-музей, але і "музеефікаваную" вёску, на Беларусі хапае. У тым ліку і сярод асобных малазямельных фермераў. Ініцыятыва "знізу", словам, ёсць.

А вось для рэалізацыі, па-мойму, штуршка не стае. І штуршка, зноў-такі, — "знізу": не на міністэрскім, абласным, а менавіта на раённым узроўні. І няхай такія музейныя хаты стануць альбо праявамі прыватнага прадпрымальніцтва, альбо працягам дзяржаўнага клопату аддзелаў культуры аб далейшым развіцці сельскіх рэгіёнаў. Не так усё гэта і важна для агульнага ды ўзаемакарыснага выніку. На мой капыл, вось такое "музейнае" захаванне асобных, сапраўды адметных традыцыямі, але знікаючых з дэмаграфічных прычын вёсак — нагода якраз для агульных, дзяржаўна-прыватных, высілкаў. Гэтак жа неаспрэчна для мяне і тое, што любую ініцыятыву "знізу" трэба "знізу" і падтрымліваць. Інакш ідэі так і застануцца ідэямі...

**Яўген РАГІН**

## РЭГІЁНЫ: МАЙСТАР-КЛАС КРЭАТЫВУ

# Рамеснік "прарастае" ў майстра

**Гэтым разам мы ўзялі пад увагу творчы патэнцыял работнікаў раённых дамоў рамёстваў. Іх роля ў захаванні і развіцці традыцыйнага мастацтва — неацэнная. Дзякуючы ім захавалася повязь пакаленняў. Як і калісь, карэннае рамяство (выток і якога — у любові да Бацькаўшчыны) перадаецца ад бацькі сыну, ад маці — дачцэ. І рамеснік пакрысе становіцца майстрам, здольным на нечаканае мастацкае ўвасабленне ўласных думак, мар і спадзяванняў. І ў плеценым поясе, задымленай кераміцы, вышываным ручніку паўстае мінуўшчына, асветленая прыкметамі сённяшняга дня. Так у аблічы ўнука-падшыванца неўтаймоўна "прарастаюць" рысы прадзеда-мудраца. І за гэтымі творцамі — будучыня.**

### Свіслаччына:
на кірмашы — і тэатр, і заапарк

Менавіта яны, рамеснікі-майстры, задумалі адрадзіць у Свіслачы кірмаш, які ў пазамінулым стагоддзі быў у Еўропе другім па маштабнасці пасля Зэльвенскага. Па словах начальніка аддзела культуры Свіслацкага райвыканкама Ірыны Паўлючэня, еўрасаюзаўскія структуры з гатоўнасцю выдаткоўваюць грошы на рэалізацыю гэтага трансгранічнага творчага праекта.

А дырэктар мясцовага РДР Наталля Пучкіна распавядае, што справа традыцыйнага мастацтва пашырае ў раёне сферу ўплыву: у вёсцы Сакольнікі адкрываецца сельскі дом рамёстваў, кіраваць якім будзе Жанна Сыраежка, якая і кошыкі пляце, і паясы. У планах таксама — адраджэнне мясцовай дрэваапрацоўкі.

А кірмаш, пачынальнікам якога быў мецэнат Вінцэнт Тышкевіч, пройдзе на цэнтральнай плошчы Свіслачы наступным летам. Свае тавары прапануюць мясцовыя народныя майстры. Мяркуецца, што гэтым днём жыхары Свіслаччыны пабачаць, як і ў XIX стагоддзі, кірмашовы прывязны заапарк, а таксама — выступленне народнага тэатра.

### Касцюковіччына:
карцы ішлі на ўра

Праз салон-краму Касцюковіцкі РДР ужо рэалізаваў тавару больш чым на сем мільёнаў рублёў. Але наладжаны не толькі стацыянарны продаж работ дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Дырэктар установы Віктар Давыдоў распавёў, што пад час "Дажынак-2012" у Горках касцюковіцкія карцы (чарпакі з доўгімі ручкамі) разабралі ўвобмірг.

Сам Віктар Давыдоў таксама — разьбяр і член Беларускага саюза майстроў народнай творчасці. Сёлета да гэтага саюза далучылася і мясцовая ткачыха Валянціна Волкава. Народным у гэтым годзе стаў і клуб майстроў-рамеснікаў "Спадчына", што дзейнічае пры РДР і аб'ядноўвае больш за тры дзясяткі творцаў: ганчароў, разьбяроў, ткачых і вышывальшчыц.



Кіраўнік Касцюковіцкага дома рамёстваў поўны мар і праектаў. Ён, да прыкладу, — за цэнтралізаванае забеспячэнне РДР вобласці неабходным абсталяваннем: ганчарнымі кругамі, муфельнымі печамі. Мясцовыя глінамесы карысталіся самаробнай печкай, якая напросту прагарэла. А ахвотных займацца ганчарствам — заўжды шмат.

Апошні ж праект наступны: стварэнне пры ўстанове інтэрактыўнага этнамузея — пакоя, які праз свае рэчы ды мэблю (ад іконы з набожнікам да ложка) не толькі вяртаў бы нас у касцюковіцкую мінуўшчыну, але і з'яўляўся метадычна-навучальным класам для юных рамеснікаў. Памяшканне для музея-класа ўжо знойдзена.

### Глыбоччына:
паясы для маладых

Галоўны жыццёвы праект дырэктара Глыбоцкага РДР Тацціяны Карнеевай — нарадзіць трэцяе дзіця. Але, нягледзячы на хуткі дэкрэтны адпачынак, яна дбае і аб праектах творчых.

Першы звязаны з наданнем гуртку выяўленчага мастацтва звання "ўзорны". У гуртку, якім кіруе Святлана Скавырка, — штогод па дваццаць дзяцей. Займаюцца яны маляванкамі — роспісам па палатне, унікальным відам мастацтва, які бярэ свой пачатак ад Язэпа Драздовіча…

Другі праект звязаны з павелічэннем відаў платных паслуг. Маніторынгі паказалі, што маладажоны пасля заключэння шлюбу гатовы наведаць РДР, каб прыдбаць там творы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, што стануць абярэгамі для іхняга далейшага сумеснага жыцця. Адзін з такіх абярэгаў — маляўнічыя плеценыя паясы. Іх вырабам займаецца майстар-метадыст Вера Байкова.

Застаецца дадаць, што Глыбоцкі РДР быў створаны на пачатку 1990 года і стаў першым не толькі на Віцебшчыне, але і ў рэспубліцы. Пашанотнае першынство мясцовыя народныя майстры імкнуцца захоўваць ва ўсіх кірунках сваёй творчасці.

**Крэатыў па рэгіёнах адшукваў Яўген РАГІН**

**На здымках: супрацоўнікі Свіслацкага РДР пад час адной з выставак-продажаў.**

# "Глебаўка": тур па краіне

**Мінскаму дзяржаўнаму мастацкаму каледжу імя А.К. Глебава сёлета — 65 гадоў. Заснаваная ў 1947-м, гэтая сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова (тады — вучылішча) мела рыхтаваць школьных выкладчыкаў малявання і чарчэння, а таксама мастакоў-афарміцеляў.**

Пэўны час вучылішча заставалася адзінай у рэспубліцы кузняй кадраў для выяўленчага мастацтва. Так было, пакуль у 1953 годзе Беларускі тэатральны інстытут не стаў тэатральна-мастацкім. З вучылішча пачынаўся творчы шлях такіх мэтраў беларускага мастацтва, як М.Савіцкі, Л.Шчамялёў, В.Грамыка, М.Данцыг, Г.Паплаўскі, Л.Гумілеўскі, ды іншых.

З нагоды юбілею ў Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва адбылася выстаўка жывапісу навучэнцаў каледжа: гэта больш за трыццаць работ, выкананых у часе выездаў "на натуру". Геаграфія ж пленэраў юбілейнага года — даволі багатая: "Палітра Прыдзвіння" (Полацк), "Віцебск — горад мастакоў" (Віцебск і Музей-сядзіба І.Рэпіна ў Здраўнёве), "Нясвіж — Культурная сталіца-2012", "Малюем Пакроўскі сабор" (Расія, Масква). Асобна варта згадаць "Пленэр Памяці", прысвечаны выкладчыкам каледжа, якія пайшлі з жыцця. На вернісажы адбылася і прэзентацыя каталога згаданага пленэру.




На пытанне, чаму юбілей каледжа адзначаецца выстаўкай пленэрных эцюдаў, а не грунтоўнай мастацкай рэтраспектывай, дырэктар установы Аляксандр Шантаровіч сказаў:

— Рэтраспектыўная выстаўка — ёсць. З 16 студзеня яна вандруе па краіне. Спачатку яна працавала ў Мінску, у Вялікім тэатры, дзе калісьці, пакуль мы не займелі ўласны будынак, наша вучылішча месцілася. Потым былі Гомель, Віцебск. Зараз выстаўка — у Брэсце. Магчыма, далей яна паедзе ў Польшчу, прынамсі, перамовы пра гэта вядуцца… Экспазіцыя складаецца з трох частак: 1960 — 70-я гады (многія ранейшыя творы, на жаль, не захаваліся), 1980-я — пачатак 90-х і, нарэшце, 1990-я і да нашых дзён. Завершыцца гэты "тур" па краіне і за мяжу, ізноў жа, у сценах тэатра. Зразумела, што для другога прадстаўлення там выстаўка абновіцца…

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ**

## Брэнды аднага раёна

# Любанскі стыль

**Сем пытанняў да начальніка аддзела культуры**

**У развіцці культуры таго або іншага раёна вельмі шмат залежыць ад чалавека, які ўзначальвае і каардынуе працу культработнікаў. Адзін з такіх прафесіяналаў, што працуе на сваёй пасадзе ўжо не першы год, — начальнік аддзела культуры Любанскага райвыканкама Васіль КАТКАВЕЦ. З ім "К" мае трывалыя і даўнія творчыя стасункі. Ён заўсёды адгукаецца на нашы прапановы паўдзельнічаць у "гарачай лініі" або он-лайн-канферэнцыі, пастаянна дасылае надзённыя матэрыялы, а таксама ўважліва сочыць за нашымі публікацыямі. Пісьменнік Уладзімір Ліпскі прапанаваў нам бліц-інтэрв'ю з Васілём Сцяпанавічам, дарэчы, і з нагоды ягонай круглай даты.**



**— У слове "культура" бачацца два словы: "культ" і "ўра". Чаму выгукае "ўра" культасветнік Каткавец?**

— Народнай культуры! Яна — крыніца духоўнасці. Менавіта яна нарадзіла на Любаншчыне тузін народных калектываў. Сярод іх — узорны тэатр "Летуценнікі", ансамбль народнай песні "Ярыца", Узорны фальклорны калектыў "Верабейкі", народны хор "Прасніца"… Усе яны — мае хрэснікі. І што прыемна — да народнай культуры ахвотна далучаюцца і людзі сталыя, і моладзь, і дзеці.

**— Чым можа ганарыцца культчыноўнік Каткавец?**

— Мабыць, тэатральным дзіцячым фестывалем "Чароўны куфэрак". Восем абласных форумаў прайшло ў раёне. І да нас пацягнуліся творчыя калектывы з Расіі, Літвы, Польшчы. "…Куфэрак" стаў, па сутнасці, культурным брэндам Любаншчыны.

**— Як дапамагае ў службе кніга?**

— Я люблю літаратуру і, здаецца, ведаю яе. Знаёмы з многімі творцамі. Наш раён — радзіма пісьменнікаў Паўла Шпілеўскага, Уладзіслава Сыракомлі, Івана Мураўейкі ды іншых майстроў слова. З іх кнігамі мы працуем пастаянна ва ўсіх аддзелах. Праводзім вечары літаратуры, прэзентацыі кніг, ладзім вандроўкі ў мясціны, дзе нарадзіліся, жылі, працавалі пісьменнікі. Вось адкрылі ў цэнтры горада фантан "Мурашнік". Буккросінг ля яго арганізавалі. Падтрымліваем маладых: ужо выдалі некалькі кніг у серыі "Любаншчына літаратурная"…

**— Чым "заманьваеце" ў культуру моладзь?**

— Нядаўна адкрылі ў цэнтры Любані Школу мастацтваў. Цяпер маем Палац, куды пацягнулася моладзь. Дзвесце семдзесят дзяцей авалодваюць тут майстэрствам музыкантаў, тэатралаў, мастакоў, танцораў. А яшчэ звыш ста падлеткаў упадабалі дэкаратыўна-прыкладное мастацтва…

**— Якая ваша каманда? Што за адметныя рысы вы асабіста "прышчапляеце" да яе?**

— У раёне — семдзесят адна ўстанова культуры і трыста чалавек працуюць у сістэме аддзеле культуры. Укараняю дэмакратычны, творчы стыль у працу.

**— Ведаю, вы любіце і разумееце гумар. Як ён дапамагае вам у працы, у сяброўстве, дома?**

— Гумар сапраўды дапамагае выжыць у розных сітуацыях. Мы праводзім раённы фестываль народнага гумару "У Баянічы — на гулянічы". Ездзім на святы да знакамітых аўцюкоўцаў, спораўцаў, дубінцаў. Жарты ўсе — з жыцця. Бывае, што яны і спраўджваюцца.

**— Што робіць культработніка асобай, рыцарам дабра?**

— Духоўная повязь з учарашнім днём і ўгуўнены позірк у заўтрашні. Адметнасць беларусаў былі і ёсць шанаванне традыцый да каранёў, вернасць, адданасць справе, якой служыш. Не выношу дылетанцтва. Рухаць культуру наперад павінны профі-працаголікі, сапраўдныя воіны і рыцары дабрыні…

**Фота Юрыя ІВАНОВА**

## Фестываль у суседзяў: гродзенскі фармат

# Сертыфікат на поліэтнічнасць

**"К" традыцыйна звяртаецца да замежных культурных падзей, у якіх прымаюць удзел нашы калектывы. Чарговая з іх звязана з восеньскім «Tautu muge» — «Кірмашом нацый» — святам этнічных культур, што праходзіць у Вільнюсе. У час яго праспект Гедыміна ажыўляецца. Тут можна ўбачыць рамеснікаў, мастакоў, кулінараў, спевакоў, танцораў і музыкаў. У гэтыя дні літоўская сталіца нагадвае наш Гродна, дзе ў чэрвені праводзіцца Рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур.**

Сёлета, акрамя продажу прадметаў мастацтва і народных промыслаў, ласункаў і далікатэсаў, былі прэзентаваны выстаўка рэтра-аўтамабіляў, спектакль вогненных скульптур і піратэхнічныя шоу, канферэнцыя «Паўночныя Афіны: дыялог паміж Усходам і Захадам»; канцэрты артыстаў з польскага Гданьска, рускай, украінскай, нямецкай, грэчаскай дыяспар Літвы. Спецыяльна запрошанымі гасцямі былі беларусы: маладыя, але амбітныя рок-гурты «Relikt» і «Рокаш», калектывы вясёлых музыкаў-эксцэнтрыкаў «Рэха» і «Пава», носьбіт традыцый беларускай дуды і аўтэнтычных спеваў — гурт «Ветах». Некаторыя з запрошаных калектываў маюць прыхільнікаў між літоўскіх слухачоў, сяброў сярод дыяспар.

На «Tautu muge» гандлёвыя рады падзелены на этнічныя зоны (польская, латышская і г. д.). А гэта — больш за дзве тысячы рамеснікаў, народных мастакаў, майстроў, прадстаўнікоў фермерскіх гаспадарак, якія спецыялізуюцца на нацыянальных кулінарных традыцыях. Паводле ўмоў свята, прадметы мастацкай культурнай спадчыны і кулінарныя прадукты могуць быць зроблены як з выкарыстаннем старых тэхналогій, так і ў адпаведнасці з новымі, але павінны захоўваць спрадвечныя ўнікальныя характарыстыкі ды якасны склад.

З дапамогай «Кірмашу нацый» практыкуецца захаванне рамёстваў, старадаўніх рэцэптаў і каранёвых жанраў мастацтва этнасаў Літвы, у тым ліку — беларусаў.

**Вячаслаў КАЛАЦЭЙ,**
**загадчык кафедры этналогіі і фальклору Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў**

**Здавалася б, нядаўна "К" агучыла ідэю Музея фатаграфіі сярод пажаданых у сталіцы — і тут жа атрымала звестку пра стварэнне Музея фатаграфіі ў Гомелі.**
**Музей гісторыі горада літаральна на тым самым тыдні, калі выйшаў нумар "Культуры", заявіў пра намер бліжэйшым часам адкрыць адпаведны філіял. Наш карэспандэнт выправіўся ў Гомель, каб даведацца пра ўсе падрабязнасці ініцыятывы.**



# Фотакантэнт з пылу гарышчаў

## Ці стане Гомель трэцім горадам на постсавецкай прасторы, дзе з'явіцца Музей фатаграфіі?

### Закон цэнтрабежнай сілы

— Усё пачалося з таго моманту, калі нашай установе яшчэ да часу яе адкрыцця зрабіў падарунак фатограф і калекцыянер Леанід Пінскі, — сустракае ў сваіх залах дырэктар Музея гісторыі горада Гомеля Юлія Купрэева, — а гэта каля ста адзінак фотатэхнікі!..

Пасля гэтага падарунка пачаў дзейнічаць закон цэнтрабежнай сілы. Пайшлі выстаўкі, вакол установы пачала гуртавацца фатаграфічная публіка, і — музей ізноў атрымаў падарунак: частку сваёй калекцыі фотатэхнікі прэзентаваў гомельскі майстар здымка Яўген Шапіра. З таго часу "агульныя намеры" аб стварэнні Музея фатаграфііператварыліся ў цалкам рэальны праект.

Прааналізаваўшы рынак музейных прапаноў абласнога цэнтра, музей, створаны на базе экспазіцыі мастацкага аддзела музея палацава-паркавага ансамбля, папоўніў свае выставачныя плошчы "кантэнтам", які распавядае пра гісторыю старажытнага, сярэднявечнага Гомеля, а таксама — пачатку XX стагоддзя…

— Гэта тыя перыяды, якія не маюць адлюстравання ў экспазіцыях Гомельскага палацава-паркавага ансамбля, Гомельскага абласнога музея ваеннай славы, — адзначае дырэктар.

Больш за тое: наведаўшы музеі гісторыі пэўных гарадоў за мяжой — у Празе, Дрэздэне, — Юлія Купрэева прыйшла да высновы, што і іх установа можа развіваць асобныя напрамкі ў сваёй дзейнасці. Вось так нарадзілася ідэя стварэння Музея фатаграфіі.

### З адной фотакарткі — цэлая гісторыя

Аднак, не адмаўляючы каштоўнасці калекцыі фотатэхнікі, будучы музей мае мець і зборы фатаграфіі.

— І ў гэтым напрамку нас не абмінула ўдача, — зрабіла невялікі ўступ Юлія Святаславаўна. — Унікальную фатаграфічную калекцыю падарыў Музею гамяльчанін Аляксандр Ласіца. Пэўная яе частка абавязкова ўвойдзе ў экспазіцыю нашага будучага музея...

Дырэктар асцярожна адкрывае шурпатую вокладку аднаго з фаліянтаў і дэманструе рарытэтныя здымкі: у старым сямейным альбоме продкаў Аляксандра Ласіцы сабраны адбіткі ад канца XIX стагоддзя да сярэдзіны XX-га.

— Гэта быў род заможных гомельскіх гараджан — сям'я Шчакудовых-Рубцовых, — распавядае Юлія Купрэева. — У ім — і кавалі, і архітэктары, і фатографы, адзін з якіх — Віктар Шчакудоў, дарэчы, трымаў уласнае фотаатэлье ў сярэдзіне XX стагоддзя. Дзякуючы здымкам Шчакудова ды іншых майстроў мы сёння можам бачыць, як жылі гамяльчане ў тыя часы…

Сёння ж мы ведаем і пра фотаатэлье М.Левітэ, А.Левінмана, С.Кургана, М.Ваксмана і нашы пошукі працягваюцца. І, сапраўды, у альбоме (нароўні з "асабістымі" здымкамі сям'і — напрыклад, на ганку дома, пад час прагулкі на веласіпедах) прысутнічаюць і карткі, што паказваюць жыццё тагачаснага Гомеля: чаго вартае фота дарэвалюцыйнага горада, дзе адлюстраваны сотні салдат на малітве ля Ваеннай царквы…





Дырэктар паказвае і на іншыя фатаграфічныя падарункі Аляксандра Ласіцы. Вось альбом каляровых фотапаштовак пачатку XX стагоддзя.

— Бабуля і матуля Аляксандра Мікалаевіча надзвычайна берaглі яго, — адзначае Юлія Купрэева. — Мо двойчы за часы дзяцінства дазволілі яму паглядзець фаліянт.

Спецыяліст дэманструе яшчэ адну калекцыю — альбом фатаграфій, ужо больш набліжаных да нашага часу: 1950-х — 80-х гадоў, — ужо нашчадкаў Шчакудовых-Рубцовых.

— Прынамсі, многія фотаздымкі і дакументы прынеслі ўжо сваякі нашага галоўнага дароўцы — Аляксандра Ласіцы, — калі даведаліся пра яго ўчынак, — прыводзіць прыклад дзеяння закону згаданай цэнтрабежнай сілы дырэктар. — Ужо не ўпершыню ў нас "спрацоўвае" такая завядзёнка: толькі пачынаем нешта збіраць, аб'яўляем нейкую акцыю — і людзі далучаюцца ды прыносяць свае рэчы, фатаграфіі, дакументы… Мы ўжо неаднойчы чулі ад нашых наведвальнікаў: маўляў, калі будзем дакладна ведаць, што вось у гэтым будынку працуе Музей фатаграфіі, прынясём не адну калекцыю…

> Напэўна, чарговым горадам, дзе паўстане Музей фатаграфіі, сапраўды стане Гомель. Ідэю яго ўзнікнення падтрымлівае мэрыя абласнога цэнтра. Казаць пра дакладныя тэрміны адкрыцця пакуль зарана, аднак праект даўно мінуў стадыю "пражэкта". "Сёння мы ўжо на этапе разгляду памяшкання, — прыадкрывае карты дырэктар, — але не спяшаемся, вядома: хочацца знайсці добры варыянт, які дазволіў бы годна размясціць і пастаянную, і зменную экспазіцыі, і фондасховішча, і ўсе запланаваныя атракцыі… "

Юлія Святаславаўна распавяла і пра тое, што, дзякуючы ўсё тым жа фотаздымкам Аляксандра Ласіцы, удалося зрабіць найцікавую выстаўку рэчаў жаночага побыту пачатку XX стагоддзя.

— Мы ўбачылі на адным з фотаадбіткаў жанчыну ў моднай сукенцы таго часу, — удакладняе спецыяліст, — і вырашылі спытаць у Аляксандра Мікалаевіча: магчыма, дзе-небудзь засталіся старадаўнія рэчы яго сям'і? І што вы думаеце: рарытэты ўдалося знайсці!..

— Аказваецца, нават на прыкладзе адной фотакарткі можна распавесці цэлую гісторыю, — падсумоўвае дырэктар, — і выратаваць ад забыцця прадметы, рэчы — сведкі пэўных эпох, якія, з часам згубіўшы сваіх гаспадароў, маюць незайздросны лёс: згубіцца ў пыле гарышчаў ды сутарэнняў.

### "Юлія, ну калі ж?.."

Яшчэ дырэктар не абмінула ўвагай знойдзеную калекцыю фатаграфій Гомельскага падшыпнікавага завода: альбом расфарміраванага прадпрыемства цудам удалося атрымаць у фонды. Згадала і пра здымкі з будоўлі гомельскага аэрапорта ("Чым не ўнікальныя артэфакты?") ды пра перліну будучага Музея фатаграфіі — здымак Кексгольмскага палка, на якім адлюстравана больш за тысячу чалавек.

— Гэты ўнікальны адбітак нам прынёс стрыечны ўнук аднаго са сфатаграфаваных гвардзейцаў — Фядоса Кароткага, — кажа яна. — Мы нават зладзілі выстаўку аднаго гэтага фотаздымка, бо яго гісторыя, ды і сам ён — уражваюць! Вялізны — 98х45 сантыметраў. Усе фатографы, якія прысутнічалі на вернісажы, прызналіся, што такога яшчэ не бачылі… І яны, фотамайстры, ужо даўно ў мяне пытаюцца: "Юлія, ну калі ж адкрыецца наш музей?"…





У гэты час да нас далучыўся і адзін з галоўных ініцыятараў Музея фатаграфіі — фатограф і калекцыянер Леанід Пінскі. Аддаўшы належнае свайму "збору", ён падкрэсліў, што некаторых фотаапаратаў няма нават у Віктара Суглоба, вядомага мінскага калекцыянера фотатэхнікі.

— Гэта фотаапараты "Kodak" пасляваенных часоў, якія з Амерыкі высылаў мне мой вучань... І дарожная нямецкая камера 20 — 30 гадоў XX стагоддзя са шклянымі пласцінамі…

— У будучым Музеі фатаграфіі мы абавязкова адкрыем фоталабараторыю, каб кожны мог паспрабаваць зрабіць здымак па "старой" тэхналогіі, — падтрымала тэму "аналагавага" фота, з іншага боку, Юлія Купрэева. — А яшчэ ў нас мае працаваць фотастудыя, дзе можна будзе сфатаграфавацца ў касцюмах розных эпох, а таксама салон, у якім наведвальнікам прадставіцца магчымасць набыць копіі старадаўніх фатаграфій. І, зразумела, — выставачная зала…

— Прызнацца, я ўжо дачакацца не магу, каб убачыць сваю мару наяве, — дзеліцца спадзяваннямі Леанід Пінскі. — Колькі сёння існуе музеяў фатаграфіі на тэрыторыі былога Савецкага Саюза? Масква — раз, Шаўляй — два, а наступным мае стаць гомельскі…

Ды зноў пра фотаапараты. Цікава, што рух у пошуку артэфактаў фатаграфічнай культуры, які распачалі ў Музеі гісторыі горада Гомеля, захапіў не толькі беларусаў. У прыватнасці, на адной з выставак музейнай установы пабываў расійскі фатограф Аляксей Нікіцін з Калугі. Убачыўшы цікавосткі, ён таксама зрабіў унёсак — частку ўласнай калекцыі фотаапаратаў і фотапрылад.

■ ■ ■

Што і казаць: напэўна, чарговым горадам, дзе паўстане Музей фатаграфіі, сапраўды стане Гомель. Тым больш, ідэю яго ўзнікнення падтрымлівае мэрыя абласнога цэнтра. Казаць пра дакладныя тэрміны адкрыцця пакуль яшчэ зарана, адзначае Юлія Купрэева, аднак праект ужо даўно мінуў стадыю "пражэкта".

— Сёння мы ўжо на этапе разгляду памяшкання, — прыадкрывае карты дырэктар, — але не спяшаемся, вядома: хочацца знайсці добры варыянт, які дазволіў бы годна размясціць і пастаянную, і зменную экспазіцыі, і фондасховішча, і ўсе запланаваныя намі атракцыі…

Але музейшчыкам ужо неаднойчы давялося чуць вядомае выслоўе пра "сініцу ў руках": маўляў, вазьміце хоць штосьці, а далей — здолееце развіцца. Ды такая стратэгія не падаецца спецыялісту мэтазгоднай.

— Усё ж такі мы плануем адкрыць паўнавартасную музейную установу, — падкрэслівае яна, — з адпаведнымі аддзеламі, што будуць весці працу па захаванні, апрацоўцы інфармацыі, выставачнай дзейнасці, пошукавыя работы, і пры такім падыходзе недастаткова проста прыстойнай выставачнай залы. Перад намі — цэлы комплекс задач.

Са свайго боку, не можам не адзначыць і момант прэзентацыі тых фатаграфічных скарбаў, якія ўдалося пабачыць карэспандэнту "К". Ці атрымаюць экспазіцыі будучага музея густоўнае мастацкае ды сучаснае рашэнне, для якога, як вядома, часам вельмі істотнае значэнне мае прастора? Усё тое патрабуе пільнага разгляду і ўзважаных рашэнняў, як і належыць у дачыненні да тых ініцыятыў, што адлюстроўваюць пэўныя патрэбы часу. Хоць бы ў тым, каб зберагчы нашу візуальную спадчыну, якая год за годам зусім незаўважна і ціха сыходзіць ад нас у Лету…

**Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ,**
**наш спецыяльны карэспандэнт**
**Мінск — Гомель — Мінск**
**Фонды музея здымала аўтар**

# Лёс, "пабудаваны" тэатрам

## Гродна: гісторыя прафесійнай сцэны


Будынак тэатра ў Гродне. 1930-я.

**Сёлета Гродзенскаму абласному драматычнаму тэатру спаўняецца 65 гадоў. За плячыма — вялікі творчы шлях з дзесяцігоддзяў творчых набыткаў. Невыпадкова летась тэатр атрымаў званне "Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь". Пра ўзровень сведчыць і прэстыжная Прэмія імя Кірыла Лаўрова на XIV Міжнародным тэатральным фестывалі "Сустрэчы ў Расіі" за спектакль "Палёт над гняздом зязюлі", пра што "К" пісала…**
**Час станаўлення калектыву звязаны з постаццю Мікалая Кавязіна, заслужанага артыста БССР, рэжысёра. Гэты чалавек стаў першым мастацкім кіраўніком Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра.**

Нарадзіўся Мікалай Кавязін у Жлобіне, у сям'і чыгуначніка, у 1898 годзе. У 1905-м сям'я Кавязіных пераехала ў Мінск. Пасля заканчэння школы ў 1917 годзе Мікалай паступіў у Мінскае камерцыйнае вучылішча.

…У сярэдзіне 1920-х на спектаклях Беларускага дзяржаўнага тэатра і беларускай трупы Уладзіслава Галубка, асабліва — на прэм'ерах, можна было сустрэць зачараванага тэатральным мастацтвам юнака. У тыя гады ён працаваў у чыгуначнай школе настаўнікам малявання, удасканальваючы сваё мастацтва малюнка, выразаў фігуркі з дрэва. Між тым, працуючы ў школе, Мікалай Кавязін кіраваў драматычным аматарскім калектывам у клубе імя Леніна і драмгуртком на таварнай станцыі.

Кавязін гарнуўся сэрцам да Еўсцігнея Міровіча і Уладзіслава Галубка. Іх ацэнкі ён лічыў самымі аўтарытэтнымі, гутарыў з імі пра жыццё ды яго сцэнічнае адлюстраванне. І аднойчы прызнаўся, што ёсць у яго мара: стварыць у Беларусі дзіцячы тэатр, якога ў рэспубліцы дагэтуль не было. Міровіч з Галубком падтрымалі яго і падказалі тую школу, дзе ён можа авалодаць усімі "сакрэтамі", зразумець усе праблемы тэатра для падлеткаў, — Ленінград, Імховая, 34. Там працаваў старэйшына сярод дзеячаў дзіцячай сцэны Аляксандр Бранцаў.

Так, упершыню ў рэспубліцы быў арганізаваны тэатр для дзяцей — Тэатр юнага гледача БССР, якім Мікалай Кавязін кіраваў з 1931-га па 1937 год. Ужо першыя пастаноўкі ў тэатры дазвалялі меркаваць пра Кавязіна як пра высокапрафесійнага, з ярка выяўленым талентам, рэжысёра. Патрабавальны і строгі ў працы, па вачах акцёраў ён бачыў, хто з іх сёння не еў, хто пасварыўся з жонкай ці мужам, у каго нейкія іншыя цяжкасці, і тут жа, без прамаруджання дапамагаў, цягнуў да сябе абедаць, раіў...

Клапаціўся мастацкі кіраўнік і пра павышэнне ўзроўню калектыву, арганізоўваў паездкі тэатра ў Ленінград, дзе маладыя акцёры мелі магчымасць бліжэй пазнаёміцца з акцёрскім складам тамтэйшага ТЮГа. Вазіў у Маскву, дзе трупа не толькі глядзела спектаклі, але і слухала лекцыі.

У 1936 годзе на сцэне з'явіліся пастаноўкі па п'есах беларускіх пісьменнікаў Васіля Сташэўскага і Міхася Зарэцкага. Супрацоўніцтва з вышэйзгаданымі аўтарамі не прайшло незаўважаным: у 1937-м Кавязіна абвінавацілі ў сувязі з "ворагамі народа", і, адпаведна з гэтым, яму быў выказаны недавер як кіраўніку творчага калектыву. Пазней абвінавачванне знялі, але тэатр, для развіцця якога было зроблена шмат, давялося пакінуць. Усё ж такі сувязь з творчым калектывам, дзе яго любілі, рэжысёр захоўваў…

Час ад часу яму ўдавалася ажыццяўляць пастаноўкі на прафесійнай сцэне, скажам, у Бабруйскім калгасна-саўгасным тэатры. Відавочна не апошнюю ролю ў творчым лёсе трупы акцёраў Бабруйскага тэатра адыграла менавіта тое, што з імі, хоць і эпізадычна, вёў працу рэжысёр Мікалай Кавязін. Пазней гэтыя артысты зноў сустрэнуцца з ім: у калектывах Бабруйскага, а затым Гродзенскага абласных драматычных тэатраў. Наш герой таксама ставіў спектаклі ў Полацкім тэатры, працаваў мастацкім кіраўніком Беларускай дзяржаўнай эстрады.

З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны Мікалай Кавязін служыў байцом на бронецягніку, неаднаразова ўдзельнічаў у дэсантных аперацыях…

З канца 1944-га Кавязіна прызначаюць мастацкім кіраўніком Палескага драматычнага тэатра, што аднавіў дзейнасць у Мазыры. У яго склад увайшлі некаторыя акцёры даваеннага ТЮГа БССР. Заўсёды там, дзе з'яўляўся Мікалай Кавязін, праца ішла больш ажыўлена.

Тым часам у Бабруйску тэатр патрабаваў поўнай рэарганізацыі. Гэтую місію і даручылі Мікалаю Кавязіну. А напрыканцы красавіка 1946 года ў Бабруйскім тэатры адбыўся абмен думкамі аб творчых набытках калектыву за час працы ў ім Мікалая Кавязіна. Экзаменатарамі былі драматург і тэатральны крытык Яўген Рамановіч, рэжысёр Канстанцін Саннікаў, драматург, рэжысёр і мастацкі кіраўнік Тэатра імя Янкі Купалы Еўсцігней Міровіч. Сышліся на тым, што за гады працы ў Бабруйскім тэатры Кавязін вывеў калектыў на высокі ўзровень.

Дарэчы, тая сустрэча адыграла важную ролю ў лёсе станаўлення абласнога тэатра ў Гродне. Пасля вайны ў горадзе часова працаваў Дзяржаўны рускі драматычны тэатр БССР. Калі сталічнае памяшканне для яго было гатова, трупа ў 1947 годзе пераехала. На яе месца быў пераведзены калектыў Бабруйскага абласнога тэатра.

Нарэшце, 20 кастрычніка 1947-га Гродзенскі абласны драматычны тэатр абвясціў аб сваім адкрыцці спектаклем "Праўда — добра, а шчасце лепш" Астроўскага. Працаваць калектыў пачаў у памяшканні былога тэатра Антонія Тызенгаўза, пабудаванага ў XVIII стагоддзі. Сустрэчы з гродзенцамі распачаліся пастаноўкамі, якія ўжо былі ў рэпертуары на бабруйскіх афішах: "Памятныя сустрэчы", "Лісічкі", "Дама-невідзімка" рэжысёра М.Кавязіна.


М.Кавязін.


ГРОДНЕНСКИЙ ОБЛАСТНОЙ ДРАМАТИЧЕСКИЙ ТЕАТР

А.Н.Островский
ПРАВДА ХОРОШО, а СЧАСТЬЕ ЛУЧШЕ

Действующие лица и исполнители:
Мавра Тарасовна Барабошева — Грузд Р.И.
Амос Панфилович Барабошев — Зубаков Б.В.
Поликсена Амосовна Барабошева — Панкрат А.К.
Фелицата — Хаdина А.И.
Пелагея Григорьевна Зыбкина — Кузнецова Н.С.
Платон Зыбкин — Лавров А.И.
Сила Ерофеевич Грознов — Романов Н.Я.
Мухояров — приказчик Барабошева — Зубовский Е.И.
Меркулыч — сторож Барабошевых — Левандовский В.Я.

Художественный руководитель театра
Н.А.Ковязин

Асноўныя намаганні Мікалай Кавязін скіраваў на стварэнне новых спектакляў, праводзячы рэпертуарную палітыку дзвюма генеральнымі лініямі: класічная драматургія і сучасная — на актуальныя тэмы. У Гродне ён паставіў дзевяць спектакляў, сярод якіх — "Вялікая сіла" Рамашова, "Жылі трое сяброў" Успенскага, "Свае людзі — паладзім" Астроўскага, "На дне" Горкага. Творчы рух абумовіўся ў першую чаргу ўдалай працай Кавязіна з акцёрамі...

■■■

На праваслаўным баку старых гарадскіх могілак у Гродне стаіць дагледжаны помнік. Яго мінаюць экскурсаводы, ніколі не ўзгадваючы пра чалавека, які тут пахаваны. Гэта месца спачыну Мікалая Кавязіна, чалавека, што заклаў першы камень у падмурак Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра...

**Святлана ПЯТРОЎСКАЯ,**
**вядучы рэдактар літаратурны Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра**

# "Каралеўскія скарбы": перад вяртаннем на Альбіён

**Выстаўку "Каралеўскія скарбы: еўрапейскія шэдэўры 1600 — 1800" у Нацыянальным мастацкім музеі і ў Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Нясвіж" наведалі прыблізна 85 000 наведвальнікаў. Прычым амаль 33 000 пабачылі выстаўку ў Мінску і 52 000 — у Нясвіжы. Закрыецца экспазіцыя 4 лістапада.**

Мяркуецца, што пасля вяртання ў Лондан гэтыя экспанаты не будуць пакідаць радзіму чвэрць веку. Праект яшчэ доўжыцца, але ўжо можна падвесці некаторыя вынікі гэтай культурнай акцыі.

Адказаць на пытанне, чым стаўся для Мінска і Нясвіжа сумесны праект з лонданскім Музеем Вікторыі і Альберта, якім досведам ўзбагацілася наша музейная справа, мы папрасілі супрацоўнікаў Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь і Музея-запаведніка "Нясвіж".

**Святлана ПРАКОП'ЕВА, куратар выстаўкі ў Нацыянальным мастацкім музеі:**

— Мы і раней прымалі выстаўкі з Усходняй і Заходняй Еўропы, з Амерыкі. Праўда, у сёлетнім праекце былі моманты, з якімі мы сутыкнуліся ўпершыню. Напрыклад, Нацыянальны мастацкі музей упершыню плаціў за арэнду экспанатаў. Упершыню трэба было атрымліваць спецыфічныя ліцэнзіі, з чым раней не працавалі...

**Наталля ЖАРКО, куратар выстаўкі ў Нацыянальным гісторыка-культурным музеі-запаведніку "Нясвіж":**

— Гэта быў прынцыпова новы для нашага музея праект. Мы толькі адкрыліся, і напачатку супрацоўнічалі толькі з рэспубліканскімі ўстановамі. І вось, такі сусветна вядомы музей — у нашых сценах! Праз гэты праект мы атрымалі вялікі досвед, які, безумоўна, прыдасца нам у будучыні. За час існавання Музеем Вікторыі і Альберта назапашаны велізарны вопыт ва ўсім, што датычыцца збору экспанатаў, іх перавозкі, захоўвання, стварэння экспазіцый. Цяпер жа з гэтым досведам азнаёміліся і мы. Усе службы Музея-запаведніка "Нясвіж" былі задзейнічаны на брытанскай выстаўцы, і мы адпаведна, атрымалі свайго кшталту майстар-клас.

Хачу адзначыць яшчэ адну акалічнасць. Мы на свае вочы ўпэўніліся, што нашы нацыянальныя скарбы не горшыя за тыя каштоўнасці, што прывезлі брытанцы, і вартыя не меншай увагі. Дарэчы, брытанскія калегі далі высокую ацэнку экспанатам Нясвіжа. Я сказала б, што ў іх варта павучыцца таму, як трэба сябе любіць.

Хоць у Нясвіжа праблема не ў адсутнасці наведвальнікаў, а, хутчэй, у празмернай іх колькасці, выстаўка з Лондана паказала, што рэкламай трэба займацца не толькі напярэдадні падзеі, але на працягу ўсяго часу працы экспазіцыі, нагадваць пра яе праз тэлебачанне, радыё, прэсу.

І апошняе: мы і надалей збіраемся прымаць выстаўкі з-за мяжы. Для гэтай мэты рэалізуем праект "Выставачная зала". Прадметы з Музея Вікторыі і Альберта былі прадстаўлены непасрэдна ў залах асноўнай экспазіцыі. Цяпер жа мы ствараем спецыяльную залу для выставак, абсталяваную пэўным чынам…

**Пётра ВАСІЛЕЎСКІ**



# У кадры — край

## Гран-пры — нашчадкам друцан

**Сёння ў нашай краіне нікога не здзівіш разнастайнай дакументальнай кінапрадукцыяй. Цікавыя краязнаўчыя відэапраекты, прысвечаныя спасціжэнню нашай мінуўшчыны, ствараюцца і ў рэгіёнах краіны. Нягледзячы на аматарскі "статус" большасці з іх, асобныя прыемна ўражваюць цікавымі тэмамі, лагічна выбудаванымі сюжэтнымі лініямі, годнай апаратарскай работай.**

Большая частка аматарскіх фільмаў так і не даходзіць да шырокай аўдыторыі. Выправіць такую сітуацыю паспрабавалі ў Вілейцы, дзе днямі ў Гарадскім палацы культуры адбылося II Рэгіянальнае свята-конкурс аматарскага краязнаўчага фільма "Гэта мой край". Паводле задумы стваральнікаў кінафоруму, рэгіянальны конкурс мусіць даць імпульс развіццю аматарскага гісторыка-краязнаўчага кіно ва ўсёй краіне. Невыпадкова ў праекце акрамя Вілейкі былі прадстаўлены Слонім, Наваполацк і Талачын.

Усяго ўвазе гледачоў прапанавалі шэсць стужак, папярэдне адабраных прадстаўнічым журы конкурсу на чале са сцэнарыстам Уладзімірам Марозам. У склад судзейскай калегіі ўвайшлі прафесіяналы з Нацыянальнай кінастудыі "Беларусьфільм".

Згодна з рашэннем журы, атрымала Гран-пры і стала пераможцай у намінацыі "За лепшае рэжысёрскае рашэнне" стужка "Мы нашчадкі друцан" Дзмітрыя Ґучанкі — кіраўніка народнай кінастудыі "Летапіс" пры Талачынскім гарадскім доме культуры. Фільм распавядае пра гісторыю Друцкага княства, аднаго з найстаражытных феадальных уладанняў на тэрыторыі нашага краю і ўзнікла пад час драблення Полацкай зямлі — спадчыны славутага Усяслава Чарадзея. Княства размяшчалася на тэрыторыі сучасных Талачынскага, Крупскага і Круглянскага раёнаў.

Як прызнаўся стваральнік фільма, першапачатковая стужка была створана працягласцю ў сорак хвілін, але спецыяльна для фестывалю скарочана да пятнаццаці. Нягледзячы на тое, што карціна з'яўляецца дакументальнай, у ёй прадстаўлена і адмысловая мастацкая частка, у здымках якой былі задзейнічаны мясцовыя акцёры-аматары.

Дыпломам I ступені ў намінацыі "За лепшую калектыўную работу" журы конкурсу адзначыла фільм "Да хвалы алтара" Кацярыны Сібірцавай з Наваполацка. Ганаровае III месца і перамога ў намінацыі "За паэтычны тэкст да фільма" атрымала стужка "Памяць зямлі" Міхаіла Петуха з Вілейкі — краязнаўцы, аднаго з кіраўнікоў экспедыцыі "Шляхам Тышкевіча".

У рамках фестывалю адбылася прэзентацыя дакументальнага фільма вытворчасці студыі "Летапіс" — "У пошуках новай зямлі", прысвечанага некаторым старонкам з біяграфіі Якуба Коласа, і маладзёжнай студыі "КолА-ТБ" Вілейскага дзяржаўнага прафесійна-тэхнічнага каледжа. Акрамя таго, пад час краязнаўчага кінафоруму ў Гарадскім палацы культуры адкрылася выстаўка "Шляхамі Першай сусветнай вайны", а таксама экспазіцыя твораў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Вілейскага цэнтра эстэтычнага выхавання.

Як адзначыў Уладзімір Мароз, міні-кінафестываль у Вілейцы засведчыў, што ў нашай краіне, нягледзячы на цяжкасці, развіваецца аматарскае краязнаўчае кіно. "Самае галоўнае — мы ўбачылі цікавасць да дакументальнага кіно на мясцовым узроўні, падтрымку ўладамі творчай ініцыятывы", — падкрэсліў старшыня журы. На яго думку, пад час наступных фестываляў важна абавязкова праводзіць майстар-класы.

Пры гэтым відавочна наспела праблема пашырэння геаграфіі ўдзельнікаў праекта, рэкламы фестывалю не толькі ў Вілейцы, але і ў іншых кутках краіны. Тым больш, што сёння як ніколі запатрабавана краязнаўчае кіно, найперш — у турыстычным аспекце. Невялікія па памеры відэазамалёўкі, дакументальныя стужкі, прысвечаныя гісторыі, культуры, прыродзе нашага краю дэманструюць і турыстычную прывабнасць Беларусі.

**Кастусь АНТАНОВІЧ,**
**наш спецкарэспандэнт**
**Мінск — Вілейка — Мінск**

**Сёння мы прастаўляем яшчэ аднаго мастака, карані якога, як і ягоных продкаў, бяруць пачатак на беларускай зямлі. Гэта — Казімір Стаброўскі. У Беларусі яго пакуль мала ведаюць (дакладней — зусім не ведаюць), затое ў Польшчы — наадварот: там лічаць сваім, нацыянальным, ды і ў Літве ён прызнаны "духоўным бацькам", першым настаўнікам Мікалоюса-Канстанцінаса Чурлёніса. У Расіі яго прызнаюць галоўным чынам як польскага мастака, але і... рускага таксама, бо Стаброўскі атрымаў вышэйшую адукацыю ў пецярбургскай Акадэміі мастацтваў, ды і потым неаднойчы бываў у тагачаснай расійскай сталіцы, а ў гады Першай сусветнай вайны нават там жыў.**

**А якія звесткі застаюцца нам, беларусам?**

**Пра месца нараджэння? Пра дзяцінства, што прайшло на Навагрудчыне? Пра некалькі гадоў жыцця ды творчасці ў Гродзенскай губерні і ў самім Гродне? Мабыць, не толькі гэта. Я ўпэўнены, у кожнага чалавека, незалежна ад таго, як склаўся ягоны лёс, на ўсё жыццё застаецца тое, што называецца пачуццём малой радзімы, пачуццём бацькоўскай зямлі. Найбольш яркія прыклады такіх лёсаў — М.Мікешын, М.Шагал, Р.Семашкевіч, Я.Маісеенка, В.Бялыніцкі-Біруля, Н.Хадасевіч-Лежэ, якія ніколі не забывалі свае карані. Спіс можна доўжыць... Ды і самі палякі, мабыць, не могуць адмовіцца ад таго, што, да прыкладу, рускія мастакі Г.Семірадскі і А.Арлоўскі належаць таксама і польскаму мастацтву. Як, скажам, прадстаўнікі французскага мастацтва — кампазітар М.Равель і жывапісец П.Пікаса — да іспанскай культуры, а выхадзец з беларускага Дзвінска М.Ротка — да амерыканскай...**



К.Стаброўскі (у цэнтры) з калегамі пад час адкрыцця яго персанальнай выстаўкі ў Познані. 1927 г.

# "Жадаем быць не капіістамі і рукадзельнікамі, а сапраўднымі мастакамі..."

## Жыццё і лёс Казіміра Стаброўскага, жывапісца з Круплян



К.Стаброўскі. Карціна "Скарга душы" (у цэнтры).

Жыццё Казіміра Стаброўскага — выдатнага жывапісца, эстэта-сімваліста, перакананага тэасофа, — можа, і не трапляе ў рэчышча дэтэктыўнага сюжэта, як, напрыклад, яго славутых папярэднікаў Міхаіла Андрыёлі або Яна Дамеля. Але ў кожнага — свой асабісты лёс: што каму было наканавана — тое і адбылося. Хаця любое чалавечае жыццё — з'ява ўнікальная, непаўторная і мае правы на гістарычную, прынамсі, родавую, памяць нашчадкаў. Не ведаю, ці жывуць сёння прамыя нашчадкі ці сваякі Стаброўскага ды ягонай жонкі Юліі Янішэўскай (ах, што за чароўны яе партрэт напісаў жывапісец прыкладна ў 1907 годзе!), якія маглі б пакінуць нейкія ўспаміны пра таленавітага педагога і мастака так званай двухвымернай прасторы, але мы, беларусы, павінны ведаць чалавека, сына штабс-капітана рускай арміі Антона Стаброўскага.

Шляхецкі род Стаброўскіх — старажытны, вядомы з XII ст. Ён меў герб, дзе на блакітным полі была выяўлена сярэбраная падкова канцамі ўніз, а ўнутры яе — два крыжы. Шчыт увянчаны шляхецкім шлемам з каронай і трыма страусінымі (паўлінавымі) пёрамі. Падкова — славянскі сімвал рыцара, крыж увасабляе перамогу крыжа над месяцам, г. зн. язычніцтвам. Дарэчы, паўлінавыя пёры вельмі часта адлюстроўваліся ў карцінах позняга перыяду творчасці Казіміра Стаброўскага. Прыкладна такі ж герб з'яўляўся "таварным знакам" шляхецкіх родаў Чартарыйскіх, Высоцкіх, Шырмы, Каліноўскіх, Радзівілаў, Сталыпіных, Любічаў, Урублеўскіх, Чамадуравых.

У мастацкім жыцці Беларусі мяжы XIX — XX стст. галоўную ролю адыгрывалі нашчадкі паланізаванай беларускай шляхты, у сілу чаго многія мастакі, літаратары ды музыканты ўвайшлі ў гісторыю культуры Беларусі і Польшчы, часткова — Літвы і Расіі. Але нацыянальна-вызваленчы рух пазамінулага стагоддзя на былой тэрыторыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай садзейнічаў заваяванню ў грамадстве ідэалаў бліскучага рамантызму, які ўтрымліваўся да канца XIX ст. Уплыў каталіцызму, паражэнне паўстання 1863 — 64 гг. прыўносілі ў грамадскае жыццё элементы своеасаблівай містыкі, і таму ў мастацтве Беларусі, Літвы і Польшчы ўсталяваўся стыль мадэрн з яго абалонкай шматзначнай сімволікі. Гэта глыбока адчутыя, перажытыя пейзажныя ды "карцінныя" матывы радзімы, дзе праз алегарычныя вобразы і рэчы перадаецца занепакоенасць лёсам свайго народа. Дадзены тэзіс проста трэба ведаць, калі разглядаць творчасць К.Стаброўскага, які, на мой погляд, падсвядома выяўляе пачуцці нейкай страчанасці нацыі ў гістарычнай рэальнасці, акцэнтуе духоўную памяць пра страчаны "залаты век" ВКЛ. Бо працэс разбурэння нацыянальных традыцый, калектыўнага, "абшчыннага" ладу жыцця ў Беларусі мяжы стагоддзяў быў найбольш відавочны, і яго мастацкае ўвасабленне зблізкае Стаброўскага з некаторымі мастакамі, такімі, як Ф.Рушчыц, Г.Вейсенгоф, В.Вайткевіч, Л.Вычулкоўскі, В.Вейс.

У дзяцінстве і юнацтве Казімір пратаптаў уздоўж і ўпоперак не адну вярсту беларускай зямлі — ад родавага маёнтка Крупляны, што на Навагрудчыне, да Беластока і Гродна, — перш чым трапіў у Пецярбург і Варшаву. Прашу не блытаць з цёзкам па прозвішчы — палкоўнікам Іосіфам Стаброўскім, археолагам і асветнікам, удзельнікам Першай сусветнай вайны, імя якога носіць Слонімскі раённы краязнаўчы музей.

Вучыўся будучы мастак у Рэальным вучылішчы горада Беластока Гродзенскай губерні. Не ведаю, як і калі зарадзілася ў яго цяга да малявання і хто быў першым настаўнікам у гэтай справе, але пасля заканчэння вучобы ў Беластоку 18-гадовы Стаброўскі з'ехаў у Пецярбург і ў 1887-м г. без праблем паступіў у Імператарскую Акадэмію мастацтваў. Значыць, ён штосьці ўжо ўмеў, значыць, падрыхтоўка ў яго была не абы-якая. У тыя часы паступіць у Акадэмію "па блату" альбо "за хабар" было немагчыма, няхай ты з'яўляўся б нават сынам самога прэзідэнта Акадэміі, вялікага князя Уладзіміра Аляксандравіча, малодшага брата Аляксандра III. Тады кожны абітурыент павінен быў прадставіць прыёмнай камісіі свае малюнкі ды эцюды, каб быць допушчаным да экзаменаў. Значыць, і гэтыя юнацкія работы, мабыць, някепскія, меліся ў Стаброўскага. Нагадаю, што з-за нізкай якасці такіх "хатніх" матэрыялаў з першага разу не здолелі паступіць у Акадэмію нават В.Верашчагін і А.Куінджы. Бывае і такое…

Можна сабе ўявіць, якія пачуцці зведаў малады чалавек з далёкай беларускай вёскі, калі ўпершыню пераступіў парог велічнага будынка Акадэміі, у доўгіх і цёмных калідорах якой мільгалі цені Баравікоўскага і Брулова, Кіпрэнскага і Венецыянава, нашых землякоў Ванькові ча, Хруцкага і Аляшкевіча! Калі шчаслівы Казімір пабачыў сваё імя ў спісе прынятых у галоўны клас (апошні экзамен — трохгадзінны малюнак злепка гіпсавай галавы нейкага антычнага героя — ён здаў на найвышэйшую адзнаку), тут жа, па даўняй студэнцкай традыцыі, выбег у Акадэмічны сад. Там у восеньскія дні было зацішна ўтульна сярод золата ліп і клёнаў. А потым студэнты разыходзіліся хто куды: у каго былі грошы — у рэстараны, хто бяднейшы — у танныя харчэўні, іншыя ішлі ўладкоўвацца ў акадэмічны інтэрнат, які за Мікалаеўскім мостам. Можна выказаць здагадку, што Стаброўскі выбраў для свайго адпачынку карчму "Залаты якар", якая з даўніх часоў з'яўлялася для мастакоў своеасаблівым "капернаумам", дзе дапазна заседжваліся і прафесары, і творчая моладзь і дзе працавала вельмі добрая більярдная. Тут з кіем у руках часта можна было бачыць многіх "акадэмістаў" — ад прафесара Паўла Чысцякова да студэнта Ігара Грабара, — заўзятых аматараў гэтай гульні. Магчыма, гуляў тут і наш герой, у чыіх жылах цякла шляхецкая кроў чалавека з далёка не флегматычным характарам. У галоўным класе прафесара Мікалая Лаўрэцкага ён доўга не прабыў: праз паўгода, маючы выдатныя адзнакі за студэнцкія эскізы ды эцюды, трапіў у фігурны клас, а потым — і ў натурны…

Так пачалася новая старонка жыцця маладога Казіміра. Па праўдзе кажучы, сем гадоў вучобы ў Акадэміі — малавядомы перыяд з біяграфіі Стаброўскага ў Пецярбургу. Нават у польскіх ды расійскіх крыніцах пра яго — толькі некалькі сухіх слоў: даты навучання, студэнцкія ўзнагароды, назва праграмнай (дыпломнай) карціны. І — усё.

Дакладна вядома, што ягоным прамым настаўнікам быў Павел Чысцякоў. Ну, яшчэ з прыдыханнем падкрэсліваюць той факт, што Казімір таксама — вучань самога Ільі Рэпіна, хаця Ілья Яфімавіч быў у Стаброўскага настаўнікам толькі ў апошні год вучобы (1894-ы), калі ён (разам з Архіпам Куінджы, які ўзяў пейзажны клас) у выніку грандыёзнай акадэмічнай рэформы толькі-толькі стаў кіраўніком сваёй акадэмічнай жывапіснай майстэрні, а потым, праз тры гады, — і рэктарам усёй установы.

Ведаючы тагачасную "расстаноўку" педагагічных ды студэнцкіх сіл Акадэміі і наогул культурна-акадэмічную атмасферу канца XIX стагоддзя, паспрабую зараз трошкі выбудаваць карціну прабывання Стаброўскага ў Пецярбургу. Канешне ж, Павел Пятровіч Чысцякоў даў яму шмат чаго ў разуменні малюнка ды пластычнай формы. І меў рацыю Валянцін Сяроў, калі назваў яго адзіным (у Расіі) сапраўдным настаўнікам непахісных законаў формы. Калісьці ў аддзеле рукапісаў Траццякоўскай галерэі я знайшоў ліст Чысцякова да Сурыкава (ад 1882 г.), у якім ён пісаў: "…У нашым мастацтве — дзве часткі: адна мужная, цвёрдая, устойлівая — гэта малюнак; другая тонкая, ледзьве ўлоўная, пачуццёвая, пяшчотная — гэта жывапіс, каларыт, святлацень, тушоўка…"

*(Працяг будзе.)*

**Барыс КРЭПАК**

